

ГАСПАДЫНЯ ПЯКАРНІ ПРА ЎЛАСНУЮ СПРАВУ 8

МІНСК БУДАВАЛІ ЯК ІДЭАЛЬНЫ САВЕЦКІ ГОРАД 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 111 (29480)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ЛАБОВІЧ, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«За 30 гадоў у органы дзяржаўнай службы занятасці звярнулася больш за 8 млн чалавек. З іх працаўладкавана каля 5,3 мільёна чалавек; змагло прайсці прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку каля 550 тысяч беспрацоўных; атрымала субсідыі для арганізацыі ўласнай справы больш за 80 тысяч. За гэтымі лічбамі стаіць напружаная праца спецыялістаў. Сёння дзяржаўная служба занятасці — гэта па-сучаснаму абсталяваныя аддзелы працаўладкавання, якія маюць магутны інфармацыйны рэсурс, зладжаны калектыў прафесіяналаў з вялікім вопытам. У арсенале службы — розныя інструменты садзейнічання беспрацоўным у пошуку працы, а наймальнікам — у падборы неабходных кадраў».*

# Салодка-сакавіты сезон



Фота БелТА.

У Лунінецкім раёне, клубнічным краі нашай краіны, адкрыўся сезон нарыхтоўкі гэтых салодкіх ягад. З-за позняй і халоднай вясны збор ураджаю пачаўся пазней, чым звычайна. Пакуль клубніцы першага ўраджаю адпраўляюцца на рынкі і ў крамы, а хутка нарыхтоўшчыкі пачнуць пастаўляць ягаду перапрацоўчым прадпрыемствам. Напрыклад, Маларыцкі кансервавaагароднінасушыльны камбінат летам плануе набыць да 100 тон клубніц, якія будуць нарыхтоўвацца ў Лунінецкім раёне.

***На здымку:** Рыгор і Сяргей МАЙСАКІ збіраюць клубніцы на сваёй плантацыі.*

## КОРАТКА

- **Эстафета Вечнага агню стартавала ў Гродзенскай вобласці.**
- Білеты на «Славянскі базар» з 14 да 19 чэрвеня можна набыць са зніжкай.
- **Шырокая грашовая маса ў Беларусі за май знізілася на 0,3 %.**
- Аляксандр Гінцбург: «Паводле тэмп вакцынацыі можа прывесці да з'яўлення новых штамаў каранавіруса».
- **Паміж Слуцкам і Салігорскам пусцяць дадатковыя аўтобусы на перыяд ЦТ.**
- Банк развіцця вылучыць экспартны крэдыт на пастаўку беларускай сельгастэхнікі ў Манголію.

Энергетыка

# Беларусь стала атамнай дзяржавай

## Першы энергаблок БелАЭС атрымаў дазвол на прамысловую эксплуатацыю



Першы энергаблок.

**Беларусь змяніла статус краіны-навічка ў атамнай справе на атамную краіну, стаўшы 34-й такой у свеце, і ўвайшла ў так званы клуб ядзерных дзяржаў. Пускавы комплекс першага энергаблока БелАЭС быў афіцыйна прыняты ў прамысловую эксплуатацыю. З моманту свайго падключэння да энергасістэмы краіны рэактарная ўстаноўка выпрацавала ўжо амаль тры млрд кВт·г электраэнергіі, што дазволіла сэканоміць прыроднага газу больш як на 100 млн долараў.**

СТАР. 4

З нагоды

# ЛАВІ ХВАЛЮ, але не зламай галаву

## Доўгачаканы купальны сезон, нарэшце, адкрыты — не забываем пра бяспеку на вадзе

Дзяжурны матрос выратавальнага паста Таварыства выратавання на водах Савецкага раёна г. Мінска Рустам ЧАРНАВОКІ.



**Гэтым летам купальны сезон пачаўся пазней, чым у мінулыя гады. Але ўжо каля тыдня тэмпература вады ў вадаёмах Сінявокай трымаецца на адзнацы +20—21 градус. Яшчэ з пачатку мая (лічыцца, што сезон купання ў нас — з 1 мая да 30 верасня) спецыялісты Таварыства ратавання на водах працуюць ва ўзмоцненым рэжыме, а з прыходам сапраўднага цяпла работы ім дадасца. Бо гэтым летам вельмі многія грамадзяне не паедуць у адпачынак на мора.**

СТАР. 11

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «Трэба сваё рабіць»

## Хочам міру, але ахоўваем яго, развіваючы ўласнае ўзбраенне, — Прэзідэнт наведаў прадпрыемствы ВПК на Віцебшчыне

**З панядзелка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка працуе ў рэгіёнах — спачатку ў Віцебскай, а потым Магілёўскай вобласці. Учора кіраўнік краіны, як перадае яго прэс-служба, наведаў Аршанскі раён, дзе размешчаны два стратэгічна важныя ваенна-прамысловыя прадпрыемствы — вытворча-тэхнічны кластар «Вусце» і Аршанскі авіярамонтны завод.**

Па даручэнні Прэзідэнта на базе кластара «Вусце» арганізаваны пяць новых цэхаў, дзе вырабляюць, мадэрнізуюць стралковую зброю. На прадпрыемстве Аляксандр Лукашэнка ў першую чаргу азнаёміўся з тэрыторыяй, дзе размясціліся вытворчасці. Як далажыў Прэзідэнту старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Дзмітрый Пантус, вытворча-тэхнічны кластар знаходзіцца на тэрыторыі ў 277 га, але магутнасці займаюць толькі дзясятую частку. На працягу найбліжэйшых гадоў плануецца асвоіць усю плошчу. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што такая вялікая тэрыторыя — празмернасць.

«Трэба тэрмінова прапрацаваць пытанне, каб ніякіх празмернасцяў тут не было. Навошта такая тэрыторыя? — спытаў Аляксандр Лукашэнка і звярнуў увагу на ўтрыманне гэтых земляў: на працягу года трэба навесці ідэальны парадак. Губернатар за гэта персанальна нясе адказнасць».

Прэзідэнт наведаў участак, дзе вырабляюць айчынныя патроны трох тыпаў: для грамадзянскай зброі калібру 9 мм Luger (9x19), 7.62x39, 7.62x54R, у працэсе пастаноўкі на вытворчасць — патроны для баявой зброі калібру 9 мм Makarov і 7.62x39.

Аляксандр Лукашэнка ў цэху рэгламенту і рамонту авіяцыйных кіраваных ракет звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць лакалізацыі вытворчасці. Важна, каб на прадпрыемстве выраблялася і знешняя абалонка ракеты, і кампаненты сістэмы кіравання і навядзення. «Трэба сваё рабіць, асноўнае», — сказаў Прэзідэнт. Неабходнасць гэтага, паводле яго слоў, дыктуецца нестабільнасцю абстаноўкі ў свеце, пастаянна ўзнікаюць выклікі і пагрозы з боку знешніх сіл.

«Хто гарантуе, што мы не будзем ваяваць? Ні ты, ні я, ніхто не можа гарантаваць. Свет адурэў наогул. Вайна можа ўспыхнуць у любы момант у любым пункце, не дай бог у нас», — папярэдзіў кіраўнік краіны. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра важнасць навучання насельніцтва карыстацца стралковай зброяй.

Навыкам абыходжання са зброяй навучаюць тых, хто праходзіць падрыхтоўку ва Узброеных Сілах, аднак ёсць значная колькасць тых, хто не трапляе ў войскі па прызыве. Вось на іх і варта звярнуць увагу, перакананы Прэзідэнт: «А чаму студэнтаў і іншых не прыцягнуць і не навучыць стралковай зброяй карыстацца — сабраць, разабраць аўтамат, стрэльнуць? Каб умелі карыстацца і каб не давялося ў цяжкія часы вучыцца на полі бою».

Пасля Аляксандр Лукашэнка накіраваўся на Аршанскі авіярамонтны завод — вядучае прадпрыемства Беларусі па капітальным рамонце і мадэрнізацыі верталётаў Мі, абсталявання і сістэм розных тыпаў паветраных судоў, па тэхнічным абслугоўванні самалёта Іл-76.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з работай прадпрыемства, узорамі авіятэхнікі, рамонтам якой цяпер займаюцца на прадпрыемстве. Размова таксама ішла аб далейшым развіцці аэрадрома Орша. Расказаў генеральны дырэктар прадпрыемства Павел Случак пра будаўніцтва новага цэха па рамонце дэталяў і вузлоў верталётаў і самалётаў, якія плануюць увесці ў эксплуатацыю ў 2023 годзе.

«Гэта будзе новая сучасная вытворчасць, дазволіць нам мінімізаваць усю закупачную частку і стварыць новыя працоўныя месцы, — адзначыў ён. — Маштаб праекта разам з абсталяваннем — прыкладна 32—35 мільёнаў беларускіх рублёў».

Праблем з загрузкай у Аршанскага авіярамонтнага завода цяпер няма. «На гэты год мы загружаныя. Нашы традыцыйныя рынкі — гэта Цэнтральная Азія, Паўднёва-Усходняя Азія, Афрыка, Паўднёвая Амерыка. Ёсць шэраг краін, кантракты з якімі знаходзяцца ў глыбокай ступені прапрацоўкі», — дадаў гендырэктар.

Размова на прадпрыемстве таксама ішла аб далейшым развіцці аэрадрома Орша. Раней гэтыя тэрыторыі належалі заводу, але пасля частка была перададзена ва ўласнасць Нацыянальнага аэрапорта Мінск. «Тут усё будзе дзяржаўнае, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Дзяржаўным завод будзе, ён пашыраецца. Аэрадром — дзяржаўны. Дзяліць тут няма чаго, усё гэта дзяржаўнае».

На слыху

# ЧАРГОВЫЯ КРОПКІ НАД «і»

**Учора ў Нацыянальным прэс-цэнтры прайшоў брыфінг МЗС, арганізаваны з удзелам прадстаўнікоў сілавых ведамстваў, дыпламатаў, замежных і айчынных СМІ. Было агучана шмат рэзанансной інфармацыі, якая датычылася і сітуацыі з пасадкай у Мінску самалёта кампаніі Ryanair, і нібыта прымусовай высылкі беларускіх палякаў. Навінкай было з'яўленне на брыфінгу ў якасці спікера затрыманага былога рэдактара забароненага ў Беларусі экстрэмісцкага тэлеграм-канала Рамана Пратасевіча, які зноў гаварыў тое, што не вельмі прыемна было чуць нашым апанентам.**

Раман Пратасевіч расказаў, што яго ніхто не прымушае даваць інтэрв'ю СМІ і супрацоўнічаць са следствам.

«Я магу сказаць шчыра, што ніякага гандлю са следствам у мяне было. Любы мой удзел, у тым ліку і ў гэтым мерапрыемстве, з'яўляецца выключна добраахвотным, як і інтэрв'ю спадару Маркаву (кіраўнік тэлеканала АНТ. — **«Зв».**). Мяне ніхто не прымушае. І мяне ніхто ніколі не прымушаў да поўнага супрацоўніцтва са следствам. Гэта выключна мой выбар і маё рашэнне», — сказаў Раман Пратасевіч.

Па яго словах, супрацоўніцтва з органамі выклікана разуменнем, якую шкоду ён нанёс краіне і дзяржаве, і хоча зрабіць усё, каб выправіць гэтую сітуацыю.

Пакідаючы праект Nexta і Варшаву, Раман Пратасевіч спадзяваўся, што будзе працаваць фатографам у штабе Святланы Ціханоўскай у Вільнюсе і сустрэне там ідэйных людзей. «Я першыя пару месяцаў бачыў вакол сябе людзей такіх жа, як і я, якія верылі ў тое, што яны робяць. На жаль, пазней сітуацыя стала моцна мяняцца. Чым меншымі станавіліся пратэсты, тым больш пачалося ўнутраных разборак, незразумелых мне палітычных гульняў, якіх я стараўся пазбягаць, і асабістых амбіцый. Тыя рэчы, у якія я верыў, пачалі ператварацца ва ўласныя разборкі», — акцэнтаваў увагу журналіст, дадаўшы, што ён увогуле хацеў сысці з палітычнай дзейнасці.

Раман Пратасевіч заўважыў, што ён не будзе палітычным прыхільнікам Прэзідэнта Беларусі, але паважае яго як чалавека, які змог вытрымаць ціск: «Я не кажу, што поўнасцю пераходжу на бок дзяржавы, а расказваю прычыну таго, чаму я супрацоўнічаю са следствам».

Чуткі, якія пачалі распаўсюджваць некаторыя тэлеграм-каналы, пра тое, што быццам бы яго ў СІЗА КДБ збіваў Прэзідэнт, малады чалавек назваў жартам. Накінт слядоў на руках, якія заўважылі падчас інтэрв'ю тэлеканалу АНТ, Раман Пратасевіч сказаў, што гэта былі сляды сцяжак, што надзелі пры затрыманні, бо наручнікаў у праваахоўнікаў не было.

«Накконт здароўя. Нават я пры знаходжанні ў СІЗА чуў шмат «фэйкаў», што распаўсюджвалі пра маё здароўе. Хачу сказаць, што я выдатна сябе адчуваю, я ў выдатным настроі. У мяне няма ніякіх скаргаў, калі хтосьці ў гэтым сумняваецца, я гатовы з дазволу следчых прайсці любую незалежную медыцынскую экспертызу, — сказаў Раман Пратасевіч. — Ніхто мяне не біў, нават пальцам не кранаў».

Ён звярнуўся да СМІ з просьбай не распаўсюджваць чуткі, бо заложнікамі сітуацыі сталі яго бацькі, якія ў Польшчы знаходзяцца ў інфармацыйным вакууме. «Я разумею, у якой сітуацыі знаходзяцца зараз мае бацькі. І мае словы прадыктаваны клопатам пра іх. Са мною ўсё ў парадку. А яны аказваюцца заложнікамі сітуацыі. Я выдатна бачу, што іх выкарыстоўваюць. Яны ездзяць з акцыямі пратэсту, і за іх спінамі стаяць канкрэтныя палітычныя дзеячы», — дадаў ён. Затрыманы журналіст адзначыў, што яго бацькі могуць вярнуцца дадому бяспечна.

Раман Пратасевіч расказаў, што афіцыйныя паказанні зараз ён дае толькі беларускім следчым. Старшыня Следчага камітэта Дзмітрый Гара дадаў, што прадстаўнікі сілавых ведамстваў замежных краін не падавалі запытаў для ўдзелу ў працэсуальных дзеяннях з Раманам Пратасевічам і не патрабавалі яго выдачы.

Адказваючы на адно з пытанняў журналістаў, Раман Пратасевіч паведаміў, што яшчэ да таго, як ён аказаўся ў Беларусі, справы апазіцыйнага дзеяча Паўла Латушкі былі «дрэнныя».

«Зыходзячы з той інфармацыі, якой я валодаю, — а я меў зносіны з многімі людзьмі, — Паўлу Паўлавічу пастаўлены ўльтыматум з боку польскіх улад. Польшча і Літва вядуць прамую канкурэнцыю па беларускім пытанні. Калі ў літоўскага боку існуе штаб Святланы Ціханоўскай, то адпаведна ў афіцыйнай Варшавы ёсць толькі Латушка. Таму што ён не праяўляў ніякай актыўнасці, яму была пастаўлена ўмова, што да верасня ён павінен актывізавацца і паказаць сваю падтрымку, правесці ўласныя акцыі», — заявіў Раман Пратасевіч і дадаў, што цяперашнія акцыі на граніцах Беларусі звязаны з асобай Паўла Латушкі.

Пратасевіч трымаўся свабодна, жартаваў і нават загадаў прысутным палітычную загадку. «Гэта жанчына, палітык, яна жыве ў адной з еўрапейскіх краін. Яна заклікала не плаціць падаткі, не прызнаваць «нелігітымны» ўрад, заклікала армію пераходзіць на яе бок. Яна пачала ствараць не толькі альтэрнатыўны ўрад, але і альтэрнатыўныя пасольствы сваёй краіны за мяжой». І сам жа агучыў правільны адказ, для многіх нечаканы: «Гэта палітык з Аўстрыі Моніка Унгер. У 2019 годзе яна атрымала 14 гадоў зняволення за спробу мяцяжу. Знаёмыя пункты, вы не знаходзіце?..»

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Даслоўна

#### «ФІГУРАНТЫ ВЫЕХАЛІ Ў ПОЛЬШЧУ ДОБРААХВОТНА І БЕЗ ЯКІХ-НЕБУДЗЬ УМОЎ»

**Старшыня Следчага камітэта Дзмітрый ГАРА расказаў на брыфінгу, як ішлі перагаворы аб вызваленні польскіх актывістак Ірэны Бярнацкай, Марыі Цішкоўскай і Ганны Панішавай.**

«Гучаць супярэчлівыя заявы, па-першае, паказваючы на прымусовы характар выправаджэння гэтых асоб супраць іх волі, і адначасова гучаць заявы, што польскі МЗС актыўна ўдзельнічаў у рэалізацыі гэтага працэсу, — сказаў Дзмітрый Гара. — Гэта з'яўляецца выключна жэстам добрай волі беларускага боку, прадыктаваным гуманітарнымі меркаваннямі і прынцыпамі добрасуседства. Ініцыятарам названага рашэння з'яўляецца афіцыйная Варшава. Пры гэтым польскі МЗС не мае да гэтага абсалютна ніякага дачынення. Пытанне вырашалася па лініі спецыяльных службаў».

Па яго словах, кіраўніцтва Казахстана па просьбе польскага прэзідэнта звярнулася да Аляксандра Лукашэнкі з хадайніцтвам аб магчымасці выезду асобам, абвінавачаным у злачынствах у сферы распальвання нацыянальнай і рэлігійнай варожасці і розні. Абвінавачаных наведаў консул Польшчы Анджэй Рачкоўскі, на прапанову якога пакінуць СІЗА і краін яны адказалі згодай.

Паводле слоў старшыні Следкама, усе фігуранты выехалі ў Польшчу добраахвотна і без якіх-небудзь умоў. «Разам з тым па цяперашні час яны застаюцца абвінавачанымі па крымінальнай справе, якая мае пэўную судовую перспектыву, — дадаў Дзмітрый Гара. — Хочацца адзначыць, што дэманстратыўная і ўсвядомленая адмова польскага боку ад выканання прынцыпу канфідэнцыяльнасці ставіць пад абгрунтаванае сумненне раней заяўленую Варшавай зацікаўленасць выезду ў Польшчу пакінутых двух фігурантаў гэтай крымінальнай справы. Напэўна, іх лёс там ужо мала каго цікавіць.

Дзмітрый Гара выказаў меркаванне: прычына таго, што адбываецца, — ва ўнутраных палітычных раскладах сумежнай дзяржавы і імкненні асобных дзеячаў зарабіць лёгкія палітычныя балы нават у шкоду інтарэсам «асоб, аб правах якіх яны нібыта дбаюць».

### Даслоўна

**Генерал-маёр Ігар ГОЛУБ, камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл:**

«Звесткі аб'ектыўнага кантролю пераканаўча пацвярджаюць, што ніякага перахопу, прымусовага развароту ад дзяржаўнай граніцы і прымусовай пасадкі самалёта Ryanair не было. Гэта было неаднаразова даказана і паказана ўсім жадаючым аб'ектыўна разабрацца ў сітуацыі. Па наяўных у нас пэўных даных, гэты факт таксама прызналі ў сваіх закрытых крыніцах інфармацыі і мае калегі па прафесіі ў краінах НАТА, якія мяжуюць з Беларуссю... Мы ўважліва вывучылі траекторыю палёту самалёта Ryanair у паветранай прасторы Беларусі, інструкцыі па ажыццяўленні палётаў, схемы заходу на пасадку ў аэрапорце Вільнюс. Незразумелае доўгае маўчанне ў радыёэфіры камандзіра паветранага судна (каля 12–14 хвілін) падчас прамалінейнага палёту праз тэрыторыю Беларусі ад паўднёвага ўчастка дзяржграніцы да пачатку развароту, а таксама яго паводзіны пасля пасадкі ў аэрапорце Вільнюса і маўчанне ў СМІ да гэтага часу. Мы так і не пачулі яго каментарый пасля 23 мая і да сённяшняга дня, акрамя адной заявы прадстаўніку паліцыі ў Вільнюсе. Але гэты каментарый прыбраны з усіх крыніц».

**Арцём СІКОРСКІ, дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый:**

«Не чакаючы нават папярэдніх вынікаў расследавання ІКАО, уся Еўропа, якая выступае за вяршэнства права, звалілася ў беззаконне, у поўнае зневажанне нормаў міжнароднага паветранага права, стварыўшы ў сусветнай авіяцыі нестабільнасць і непрадказальнасць — галоўных ворагаў бяспекі. І самае страшнае, што да гэтага часу многія не разумеюць, што яны нарабілі. Таму мы зараз і назіраем, што вынікі расследавання акрамя Беларусі нікому не патрэбныя».

# РАЗАМ МЫ МОЦНЫЯ

## Што вылучае стратэгічных партнёраў?

**Учора адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з пасла Расіі ў Беларусі Яўгеніем Лук'янавым.**

У самым пачатку размовы спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што ў свеце, відаць, больш няма такіх аналагаў яднання, добрасуседства, братэрства і дружбы, як адносіны паміж народамі Беларусі і Расіі. Калі ёсць надзейнае плячо брата — гэта вельмі важна. Наталля Качанава высока ацаніла той палітычны дыялог, які складваецца паміж краінамі і прэзідэнтамі абедзвюх дзяржаў, што спрыяе развіццю двухбаковага супрацоўніцтва ў розных сферах. Нашы прэм'ер-міністры супрацоўнічаюць вельмі плённа, у выніку і ўрады працуюць паспяхова. У інтэграцыйных структурах мы падтрымліваем адзін аднаго ў гэты няпросты перыяд для нашых краін. Наогул, у нас узаемадзейнічаюць усе структуры, дзяржаўныя і грамадскія, звярнула ўвагу спікер.

Паводле яе слоў, Расія — наш стратэгічны партнёр, з якім мы гатовы да супрацоўніцтва па ўсіх напрамках. Праўда, летась з-за пандэміі зменшыўся тавараабарот. Але сёлета ўжо ёсць рост. Ёсць здабыткі і ў гуманітарнай сферы, пашыраецца ўзаемадзеянне маладзёжных арганізацый і міністэрстваў адукацыі.

Падчас сустрэчы Наталля Качанава таксама зазначыла, што склаліся вельмі добрыя адносіны і паміж парламентарыямі. У Беларусі гэта высока цэняць. Напрыклад, старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі Валянціна Мацвіенка — наш добры сябар і надзейны партнёр. Цяпер рыхтуецца VIII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, гэта выдатная пляцоўка для паглыблення ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні. Форум сёлета пройдзе ў Маскве і Маскоўскай вобласці і надасць новы імпульс нашаму дзеламову ўзаемадзеянню, сказала Наталля Качанава.



Фота БелТА.

Карыстаючыся выпадкам, яна выказала падзяку Расіі за падтрымку ў барацьбе з COVID-19, за тое, што сёння ў нас ёсць вакцына і мы можам прывіваць людзей.

На думку Яўгенія Лук'янава, нашы краіны яднае і тое, што яны выдатна памятаюць сваю гісторыю. Бо народ, які забыў сваю гісторыю, не будзе мець будучыні. У нашых брацкіх народаў агульнае разуменне каштоўнасцяў і сэнсу жыцця. Невыпадкова нядобразычліўцы спрабуюць нас развесці, супрацьпаставіць адзін аднаму. Разам мы моцныя, а паасобку — слабыя. Нам не трэба абвастрэнне, санкцыі, ўнутраны ціск і г. д. Наша задача, як і ў любой нармальнай дзяржавы, — забеспячэнне годнага сацыяльна-эканамічнага жыцця нашых грамадзян. Гэта падмурак бяспекі кожнай дзяржавы, выказаў свой пагляд пасол.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

Надвор'е

# Дажджы скончацца, і будзе цёпла

### Нават горача — да 30 цяпла і вышэй

**Што ні кажы, а патрэбныя былі ападкі, вой, патрэбныя. Я ў гэтыя выхадныя палову Беларусі аб'ехаў, на захад бліжэй. Дык там дачнікі проста прасілі ў нябёсаў добрых дажджоў. Атрымалася. А цяпер зноў, як па заказах працоўных, цёплае камфортнае лета. Аж да канца тыдня захаваецца цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Больш за тое, у згаданы час наша тэрыторыя будзе знаходзіцца пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску, таму чакаецца цёплае летняе надвор'е. Пры гэтым дажджоў будзе няшмат. І заўтра большую частку сутак будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер паўночны, паўночна-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў да 15 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 20—27 градусаў вышэй за нуль.

А далей прагназуецца сонечнае надвор'е, калі 17, 18, 19 чэрвеня чакаецца абсалютна без ападкаў. У чацвер уначы і раніцай месцамі прагназуецца слабы туман. Вецер няўстойлівы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да 14 градусаў цяпла. Удзень будзе 22—28 градусаў вышэй за нуль. Не чакаецца дажджоў і ў пятніцу. Злёгку павысіцца тэмпература паветра нават уначы, калі прагназуецца 8—15 цяпла. Днём сонца «расплавіць» нас да плюс 24—30 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у суботу без ападкаў, а тэмпература паветра ўначы ўжо 10—17 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 24—30 градусаў цяпла. У нядзелю чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўднёвым захадзе краіны месцамі магчымыя кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—18 градусаў. А ўдзень будзе як на поўдні — ад плюс 25 градусаў да 31 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Меркаванні

# Адэкватны адказ на санкцыі

Учора член Прэзідыума, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец зрабіў заяву для сродкаў масавай інфармацыі наконт звароту дэпутатаў усіх узроўняў да сусветнай супольнасці ў сувязі з падзеямі вакол Беларусі, якія ініцыявалі краіны калектыўнага Захаду.

Сітуацыю, якая склалася вакол нашай краіны, сенатар ахарактарызаваў як беспрэцэдэнтную спробу палітычнага, інфармацыйнага і санкцыйнага ціску на Беларусь. Сяргей Сівец паведаміў, што ўжо завершана работа па зборы арыгіналаў подпісных лістоў ад усіх дэпутатаў і членаў Савета Рэспублікі для наступнай іх перадачы ў Міністэрства замежных спраў. Далей знешнепалітычнае ведамства нашай краіны накіруе гэтыя дакументы ў міжнародныя і міжурадавыя арганізацыі, у тым ліку і ў Арганізацыю Аб'яднаных Нацый.

Старшыня Пастаяннай камісіі выказаў надзею на тое, што зварот беларускіх дэпутатаў атрымае адпаведную рэакцыю ў свеце.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ЭКАНОМІКА ПАВІННА БЫЦЬ БЕЗ ПАЛІТЫКІ,

## лічыць кіраўнік Магілёўскага прыватнага навукова-вытворчага прадпрыемства «Тэхналіт» Аляксандр БАДЗЯКА

Магілёўскае прадпрыемства «Тэхналіт» — першы завод у Беларусі, які займаецца вытворчасцю поршневых кольцаў і гільзаў цыліндраў з адмысловага зносастойкага чыгуну прагрэсіўным метадам ліцця — намарожваннем. За распрацоўку і прамысловую рэалізацыю «Тэхналіт» сумесна з Інстытутам тэхналогіі металаў НАН Беларусі ўдастоены Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі. Прадпрыемства спецыялізуецца на дробнай і сярэдняй серыйнай вытворчасці камплектуючых і запасных частак да аўтатрактарнай, дарожнай, чыгуначнай, сельскагаспадарчай, будаўнічай і спецыяльнай тэхнікі. У краіны Еўразаюза ідзе ўсяго каля 15 % яго вырабаў, але кіраўніцтва завода сур'ёзна занепакоена прынятай Еўрапарламентам рэзалюцыі па Беларусі, у якой прапануюваецца ўвесці эканамічныя санкцыі.

— Гэта абавязкова ўдарыць і па нас, — кажа заслужаны работнік прамысловасці, стваральнік і дырэктар прадпрыемства «Тэхналіт» Аляксандр Бадзяка. — Як пастаўшчыкі камплектуючых, мы працуем з такімі вялікімі кампаніямі, як Беларускі трактарны завод, БелАЗ, МАЗ, КаМАЗ — мы ўскосна ад іх залежым. Скарачаючуюся чыгуначныя перавозкі, а мы ўжо падлічваем страты — меней рэалізуецца камплектуючых. Хтосьці пажартаваў, што санкцыі — стымул для развіцця. Але гэта дрэнны жарт. Я за тое, каб усе жылі мірна і адзін аднаго паважалі. Любая канфрантацыя — гэта дрэнна. Я па-за палітыкай, але, як любы гаспадарнік, заўсёды балюча ўспрымаю інфармацыю пра санкцыі. Усе, хто займаецца рэальнай эканомікай, супраць іх.

Класікі вызначалі, што палітыка ёсць канцэнтраванае выражэнне эканомікі. Але апошнія 30—35 гадоў майго асэнсавання жыцця, як я разумею, мы жывём з дакладнасцю наадварот. Палітыка вызначае эканоміку ва ўсім свеце. Адны друкуюць пустыя грошы, другія ўкладваюць іх у свае фонды развіцця. Якая ж тут эканоміка? Гэта чыстая палітыка. Мы жывём у рэальных умовах. Апошнія тры дзесяткі гадоў палітычныя рашэнні прымушаюць эканоміку рухацца туды, куды палітыкі пажадаюць. Гэтыя рашэнні тармозяць цэлыя рэгіёны.

Санкцыі непазбежна ўдараць па кішэні простых людзей. І палітыкам, перш чым прымаць рашэнне аб іх, варта пра гэта ўспомніць.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### САЎМІН УДАКЛАДНІЎ ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ЦТ

**Урад скарэкціраваў Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 9 чэрвеня 2021 года № 316, паведамляе БелТА са спасылкай на Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал.**

У прыватнасці, удакладнены патрабаванні да аўдыторый, у якіх плануецца правядзенне ЦТ, пытанні прадстаўлення дакументаў на рэгістрацыю прадстаўнікамі абітурыентаў (калі абітурыенты не могуць самі прыбыць у пункт рэгістрацыі па ўважлівых прычынах).

Павялічана колькасць памылковых адказаў, якія можна адмяніць, — не больш за чатыры (раней — не больш за два). Таксама ў дакуменце пазначана, што ўстановам адукацыі, вызначаным у якасці пунктаў правядзення ЦТ, неабходна прадстаўляць у РІКВ схемы нумарацыі месцаў для абітурыентаў у аўдыторыі з указаннем іх колькасці ў кожнай аўдыторыі.

Асноўныя змяненні ўступаюць у сілу з 12 чэрвеня, іншыя — з 1 верасня.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нафталі Бэнэт стаў новым прэм'ер-міністрам Ізраіля

Дэпутаты Кнэсета, аднапалатнага парламента Ізраіля, выказалі давер новаму кааліцыйнаму ўраду, у якім не прадстаўлена партыя цяперашняга прэм'ер-міністра Біньяміна Нетаньяху, паведаміла выданне Times of Israel. Такім чынам, у Ізраілі зацвердзілі новы склад урада, які ўзначаліў Нафталі Бэнэт. Па даных выдання, лідары новай кааліцыі заручыліся 60 галасамі са 120, 59 прагаласавалі супраць. Адзін дэпутат устрымаўся. Рашэнне Кнэсета паклала канец «эпохі Нетаньяху», які быў ва ўладзе больш за 12 гадоў. У рамках пагаднення аб кааліцыі першыя два гады на пасадзе прэм'ера правядзе Нафталі Бэнэт (партыя «Новыя правыя»), а пасля па правілах ратацыі пасад атрымае Яір Лапід (партыя «Ёсць Атыд»). Цяперашняя кааліцыя складаецца пераважна з левых, левацэнтрысцкіх і арабскіх партый. Яна атрымала назву «Блок перамен». У новым урадзе не будзе прадстаўнікоў партыі «Лікуд», нягледзячы на тое, што ў яе самая шматлікая фракцыя ў Кнэсеце па выніках выбараў. «У ізраільскай апазіцыі будзе вельмі выразны і гучны голас, і мы хутка вернемся да ўлады», — паабяцаў Нетаньяху з трыбуны Кнэсета.

### Швейцарцы на рэферэндуме адмовіліся плаціць за скарачэнне выкідаў $CO_2$

Жыхары Швейцарыі адхілілі прапанову ўрада ўвесці дадатковыя падаткі на бензін і авіябілеты з мэтай скарачэння эмісіі парніковых газаў. Хоць рашэнне было прынята з мінімальнай перавагай 51:49, вынікі галасавання сталі шокам для змагароў са зменамі клімату, адзначыла «Бі-бі-сі». Урад альпійскай рэспублікі распрацаваў дэталёвы план зніжэння выкідаў да 2030 года ў два разы ў параўнанні з узроўнем 1990-га, як прадугледжана Парыжскім пагадненнем па клімаце. Гэтай мэты планавалася дасягнуць, спалучаючы выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі і ўзмацненне падаткаабкладання выкапнёвага паліва. Вынікі нядзельнага галасавання сталі ўдарам па гэтым плане, заўважыла «Бі-бі-сі». На плебісцыт былі вынесены і іншыя пытанні. Швейцарцы падтрымалі надзяленне паліцыі дадатковымі паўнамоцтвамі для барацьбы з тэрарызмам і выручэнне сродкаў для падтрымкі эканомікі ва ўмовах пандэміі, а таксама адхілілі прапановы забараніць штучныя пестыцыды і вылучаць субсідыі толькі тым фермерам, якія вядуць сваю гаспадарку «без хіміі».

### Кіт праглынуў лаўца лобстараў. Але пасля выплюнуў



Па словах 56-гадовага Майкла Пакарда, ён, як звычайна, выйшаў у мора каля ўзбярэжжа паўвострава Кейп-Код у штаце Масачусэтс на сваёй лодцы. Нырнуўшы ў ваду з вадалазным рыштункам, каб сабраць з дна лобстараў, Пакард неўзабаве адчуў моцны штуршок і апынуўся ў поўнай цемры. «Я адчуваў, што я рухаюся, і што мышцы кіта сціскаюцца», — сказаў Пакард у інтэрв'ю мясцоваму выданню Cape Cod Times пасля выпіскі з бальніцы тым днём. Адчуўшы дыскамфорт, кіт затрос галавой, усплыў на паверхню і выплюнуў чалавека, які захрас у яго ў пашчы. Пакард лічыць, што прабыў там каля 30–40 жудасных секундаў. Гарбатыя кіты могуць дасягаць 15 метраў у даўжыню і важыць каля 36 тон. Па даных Міжнароднага фонду дзікай прыроды, цяпер іх каля 60 тысяч у свеце. Каб пракаментаваць, яны шырока адкрываюць пашчу і заглынаюць рыбу, якая туды заплывае. Але каб з рыбай у пашчу трапіў чалавек — гэта, мяркуючы па ўсім, рэдкая выпадковасць, лічыць Джук Робінс, мясцовы спецыяліст па кітам, з якім паразмаўляла выданне Cape Cod Times. Майкл Пакард займаецца лоўляй лобстараў каля ўзбярэжжа паўвострава Кейп-Код у ЗША 40 гадоў і, нягледзячы на просьбы жонкі змяніць прафесію, пакуль гэтага рабіць не збіраецца.

# Беларусь стала атамнай дзяржавай

## ФАБРЫКА ПЕРАДАВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Менавіта так называюць эксперты праект БелАЭС, паколькі работа станцыі адкрывае новыя магчымасці для нацыянальнай эканомікі. Тэхналогіі будуць укараняцца не толькі ў энергетыцы, але і ў прамысловасці, навуцы, медыцыне, адукацыі, транспартнай галіне, упэўнены спецыялісты атамнай справы.

Мяркуецца, што праз год на БелАЭС запрацуе другі энергаблок, у выніку чаго Беларусь зможа эканоміць ужо каля 550 млн долараў у год на замяшчэнні прыроднага газу.

— Мы не сумняваемся, што ўжо праз год будзем адзначаць прыёмку другога энергаблока і ўсёй станцыі ў цэлым, — выказаўся пасля падпісання дакументаў аб дазволе на запуск комплексу ў прамысловую эксплуатацыю **Аляксандр ЛАКШЫН, першы намеснік гендырэктара па атамнай энергетыцы дзяржкарпарацыі «Расатам»**. — Стрымальны фактар падчас будаўніцтва другога энергаблока, дарэчы, — папаўняльныя закупкі. Калі мы правадзілі пускавыя аперацыі на першым энергаблоку і нейкае абсталяванне пераставала дзейнічаць, для паскарэння працэсу яно замяшчалася абсталяваннем з другога энергаблока. Цяпер яго трэба зноў даставіць.

Прынцып стварэння электрычнасці на АЭС здаецца простым, калі не звяртаць увагі на маштаб. На лопасці турбіны дзьме пара, у выніку чаго тая пачынае круціцца. Валам турбіна злучана з генератарам, што і стварае электрычнасць, якая пасля ідзе на размеркавальныя прылады. Пара другога контуру вяртаецца, кандэнсуецца і пераўтвараецца ў ваду, якая пасля зноў награваецца і становіцца парай, растлумачыў **Сяргей СЯЎКО, вядучы спецыяліст аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў**:

— У турбіны дзве лопасці, кожная з якіх даўжынёй большая за метр, а іх агульны дыяметр — каля трох метраў. За адну секунду лопасць круціцца вакол сваёй восі 50 разоў. Пры такой хуткасці не павінна быць нават самай нязначнай вібрацыі турбіны.



**На атамнай станцыі безліч рухомых частак, якія награваюцца, таму іх трэба ахалоджваць. Робіцца гэта з дапамогай вады, якая амывае абсталяванне, што ўдзельнічае ў вырабе электраэнергіі, пасля чаго распырскваецца ў пырскальных басейнах і ахалоджваецца з дапамогай паветра. Збоку выглядае прыгожа — здаецца, нібыта працуе мноства фантанаў у некалькі радоў.**



**Турбінная зала на БелАЭС, дзе выпрацоўваецца электрычнасць.**

У «турбіністаў» ёсць нефармальны тэст — яны ставяць манету на турбіну на рабро, і калі яна не падае, значыць, усё працуе нармальна.

Насамрэч, вядома, усё нашмат больш складана. Сістэма аховы станцыі настолькі цесная, што проста каб трапіць на работу, супрацоўнікі штодня праходзяць праз складаную сістэму ідэнтыфікацыі, якая апазнае іх па росце, вазе і сятчатцы вока. Атамшчыкі жартуюць, што пры такой праверцы мусяць падтрымліваць сябе ў тонусе, каб пасля не думаць, як тлумачыць аўтаматыцы, што ты — гэта ты, проста набраў пару кілаграмаў.

## ДАДАТКОВЫ ЗАПАС БЯСПЕКІ

Праект БелАЭС — вынік шматгадовай работы па стварэнні першага рэактара, незлічоных праверак, тэстаў, даследаванняў. Дадатковымі даследаваннямі, а дакладней — ацэнкай запасаў бяспекі, якія мае станцыя звыш прадугледжаных заканадаўствам, сталі праведзеныя на працягу апошніх трох гадоў стрэс-тэсты. Падчас такой ацэнкі правяралася ўстойлівасць АЭС да землятрусаў, цунамі і іх спалучэнняў, яе рэакцыя на поўнае адключэнне, а таксама паводзіны персаналу пры рабоце з цяжкімі запраектнымі аварыямі, заўважыла **Вольга ЛУГАЎСКАЯ, начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС Дзяржатамнагляда**:

— Па выніках такой самаацэнкі Беларусь падрыхтавала нацыянальны даклад, у межах якога былі прапанаваны розныя варыянты і рэкамендацыі па ўмацаванні бяспекі. Рабілася ўсё гэта добраахвотна, як і ўдзел у партнёрскіх праверках з боку еўрапейскіх калег. Сёлета ў два этапы праходзіла працэдура агляду, наколькі выконваюцца рэкамендацыі, якія былі ўключаны ў план дзеянняў краіны па ўмацаванні ўзроўню бяспекі. На першым этапе разглядаліся рэкамендацыі, выказаныя еўрапейскімі партнёрамі, якія, на іх думку, павінны былі быць выкананы да моманту прамысловай эксплуатацыі станцыі. Усе фізічныя дзеянні накшталт дадатковай крыніцы энергіі, а таксама дадатковыя механізмы і інструменты па ўмацаванні бяспекі былі імплементаваны на станцыі.

Другі этап прадугледжвае працяглую перспектыву. Гэта больш ацэначныя пытанні, а таксама ўкараненне і развіццё стацыянарнай сеткі сейсмадатчыкаў, аналіз усіх эфектаў і ўплываў. У канцы жніўня Беларусь чакае чарговую партнёрскую праверку, а пад канец года — паўторную місію IRRS, якая ў 2016 годзе ацэньвала гатоўнасць інфраструктуры рэгулявання ў краіне-навічку, якой тады была Беларусь. Цяпер гэтая місія будзе разглядаць, наколькі рэалізаваны выдадзеныя нашай краіне ў 2016-м рэкамендацыі, пяснiла Вольга Лугаўская.

У сярэдзіне лета АЭС чакае місію IPPAS, якая ацэніць нацыянальны рэжым забеспячэння фізічнай ядзернай бяспекі самой станцыі, ядзерных матэрыялаў і ўстановак, а таксама інфармацыйную і камп'ютарную бяспеку.

Штогод, як плануецца, на АЭС будзе выпрацоўвацца каля 18,5 млрд кВт·г, што дазволіць забяспечыць да 40 % унутраных патрэб краіны ў электраэнергіі. У плане міжнароднай кліматычнай бяспекі крыніца стабільнай экалагічна чыстай энергіі (БелАЭС) дазволіць скарачаць выкіды парніковых газаў больш як на 7 млн тон у год.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ДОМА, МАШЫНЫ І ЧАЛАВЕКА

## Электрычныя, экалагічныя, рэсурсазберагальныя

**Колькасць электразарадных станцый у Беларусі ўжо налета перавысіць лік існуючых аўтазарадных станцый, а да 2030-га ў краіне стане 500 тысяч электракараў, якім спатрэбіцца 4,5 млрд кВт·г у год. Пры гэтым доля мясцовых відаў паліва (МВП) у сістэме ЖКГ на працягу пяцігоддзя перавысіць 52 %. Пра прыярытэты ў галіне энергазберажэння Беларусі, мерапрыемствы, скіраваныя на ўстойлівае энергакарыстанне і рэсурсазберажэнне, новаўвядзенні праграмы энергазберажэння на 2021–2025 гг. і тэхналагічныя навінкі ў гэтай галіне расказалі эксперты.**

## ГІГАКАЛОРЫ З МВП І АКЭ

У мінулай пяцігодцы пры задачы эканоміі 5 млн тон умоўнага паліва (т у.п.) паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР) краіна сэканоміла 5,2 млн т у. п. А пры заданні выкарыстання долі мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў (МПЭР) у валавым спажыванні ПЭР на ўзроўні 16 % дасягнута 16,7 %. Аб'ём выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) склаў 7,4 %. Пры гэтым энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту (ВУП) за пяцігодку знізілася на 1,2 %. Па гэтым паказчыку Беларусь апераджае Казахстан, Расію, Украіну, а таксама іншыя краіны СНД і Канаду, наблізілася да Швецыі і Фінляндыі. Усё гэта робіцца дзеля таго, каб наша прадукцыя была канкурэнтаздольнай на рынках, каб павышалася наша энергетычная незалежнасць, паведаміў **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржстандарту — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці**:

— Глабальныя і стратэгічныя задачы на пяцігодку застаюцца ранейшымі. Як мага менш імпартаваць вуглевадароднага паліва і, адпаведна, менш траціць на гэта валюты і як мага больш выкарыстоўваць МПЭР і АКЭ, каб забяспечваць людзей работай, заробкам і плаціць падаткі ўнутры краіны. Плануецца, што энергаёмістасць ВУП зменшыцца да ўзроўню 2020 года на 7 %, а доля МВП застанецца на існуючым узроўні. З улікам уводу ў эксплуатацыю БелАЭС, каб выкарыстанне МПЭР засталося на ранейшым узроўні, іх аб'ёмы неабходна павялічваць.

За пяцігоддзе, як мяркуецца, будзе ўведзена 89 энергакрыніц на біяпаліве агульнай цеплавой магутнасцю 491 МВт. А ўжо сёлета доля выкарыстання мясцовага паліва ў камунальнай гаспадарцы павялічыцца на 7-8 %. Гэта значыць, што кожная другая гігакалорыя ў ЖКГ будзе выпрацоўвацца з выкарыстаннем біяпаліва, торфу і АКЭ.

## ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ ДЛЯ ВАДЫ, ЦЯПЛА І ЕЖЫ

Каб максімальна павялічыць рацыянальнае спажыванне электраэнергіі, у тым ліку і ў сістэме ЖКГ, будуць уводзіцца ў эксплуатацыю як электракатлы прамога награвання, так і энергакрыніцы ў малых і сярэдніх спажыўцоў з выкарыстаннем цеплавых і электрычных кампрэсійных цеплапомпаў. Гэта новы кірунак у плане выкарыстання тэхналогій, абсталявання і атрымання канечнага выніку, падкрэсліў Міхаіл Малашанка.

Цікавым кірункам лічаць спецыялісты ўкараненне энергаэфектыўных мерапрыемстваў у шматкватэрным жыллі (гэты сектар спажывае каля 30 % усёй цеплаэнергіі ў краіне). Каля 9-10 % жылля адпавядае патрабаванням і ўзроўню, якія прад'яўляюцца да сучаснага жылля ў плане спажывання цеплаэнергіі на адзін квадратны метр — 40—60 кВт·г. Аднак гэта ў сучасных будынках, дзе рэалізаваны сістэмы рэкуперацыі цяпла, асвятлення, вентыляцыі. Большасці жылых дамоў патрэбна ад 100 кВт·г і больш на м$^2$, а каля 26 % жылля — увогуле 161 кВт·г і больш. Менавіта ў гэтай частцы — вялізны рэзерв зніжэння выкарыстання аб'ёмаў прыроднага газу, упэўнены дырэктар дэпартамента:

— У новых раёнах забудовы, дзе адсутнічаюць цепламагістралі і энергакрыніцы, якія валодаюць рэзервам магутнасці, шматкватэрныя дамы будуць узводзіцца з укараненнем тэхналогій па выкарыстанні электраэнергіі для гарачага водазабеспячэння, ацяплення, гатавання ежы.

Не абыдуць увагай і АКЭ, паабяцаў спецыяліст. У Аршанскім раёне ўжо рэалізаваны шэраг праектаў, дзе ў міжацяпляльны перыяд у шматкватэрных дамах гарачае водазабеспячэнне ажыццяўляецца ад аднаўляльных крыніц.

**Ірына СІДАРОК.**

Добрая справа

# ДАПАМОГА ТУТ І ЦЯПЕР

## У Сусветны дзень донара кроў здалі чыноўнікі і кіраўнікі грамадскіх арганізацый

**Учора, у Сусветны дзень донара, здалі кроў міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ, генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, кіраўнік краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Масуд ДАРА. Выязны пункт арганізавала Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа на базе свайго вучэбнага цэнтра сумесна з РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій.**



Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ *(злева)* у час здачы крыві.

Дзмітрый Піневіч у размове з журналістамі падзяліўся, што кроў здае ўжо шмат гадоў, з 17-гадовага ўзросту, калі паступіў у Ленінградскую ваенна-медыцынскую акадэмію. Цяпер працягвае традыцыю ў якасці міністра аховы здароўя.

— Донарства з'яўляецца элементам фарміравання адказнасці кожнага з нас за тых, каму патрэбна кроў. Прыкладна 100 тысяч донараў штогод здаюць кроў, з яе рыхтуецца каля 240 тон разных кампанентаў. Вельмі важна, што кроў цяпер менш запатрабавана ў экстраннай дапамозе, бо выкарыстоўваюцца новыя тэхналогіі, у тым ліку ў правядзенні планавых і экстранных аперацый, адпаведна, менш кровастрат. Таму донарская кроў больш ідзе на перапрацоўку. І гэтыя кампаненты планава выкарыстоўваюцца ў медыцынскай дапамозе дзецям і дарослым. Таму кожны, хто здае кроў, уносіць часцінку сваёй дапамогі тут і цяпер дзецям і дарослым, якія маюць у гэтым патрэбу, — адзначыў Дзмітрый Піневіч.

Ён падкрэсліў, што, нягледзячы на падрыхтаваны адпаведны законапраект, татальнага бязвыплатнага донарства ў Беларусі не будзе. Пры шэрагу паказанняў здача крыві і плазмы застанецца платнай. Бязвыплатнае донарства пры гэтым таксама не бясплатнае. Усе донары атрымліваюць кампенсацыі на харчаванне, аднаўленне і за патрачаны рабочы дзень.

— Бязвыплатнае донарства — гэта індыкатар фарміравання грамадства, яго спеласці і гатоўнасці да сацыяльнай дзейнасці і аказання дапамогі, — адзначыў Дзмітрый Піневіч.

Генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Вольга Мычко таксама традыцыйна сярод тых, хто штогод бязвыплатна здае кроў.

— Паводле закона, падтрымка бязвыплатнага донарства з'яўляецца адной з важных задач Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Сённяшняя акцыя — гэта падвядзенне вынікаў той работы, якая праводзіцца на працягу ўсяго года, — адзначыла Вольга Мычко.

Толькі за два тыдні чэрвеня больш за 600 валанцёраў і работнікаў Чырвонага Крыжа сталі донарамі, учора — яшчэ 380 чалавек. Агулам амаль тысяча валанцёраў гэтай арганізацыі паўдзельнічала ў акцыі бязвыплатнага донарства.

— Напэўна, многія бачылі фільм «Плаці наперад». Хочацца спадзявацца, што нікому з нас донарская кроў не спатрэбіцца, але гэта тая гісторыя, калі, зрабіўшы запас, заплаціўшы наперад, мы дапамагаем іншым, — рэзюмавала Вольга Мычко.

**Дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій Фёдар КАРПЕНКА** адзначыў, што донарская кроў патрабуецца кожны дзень.

— Штодзённа ў краіне адбываецца каля 2—2,5 тысячы пераліванняў. І гэта магчыма толькі дзякуючы донарам, якія платна ці бязвыплатна, але трацяць свой час, рэсурсы і энергію, каб дапамагчы іншаму.

На выязным пункце ўчора было нарыхтавана каля 30 літраў розных кампанентаў крыві, што дазволіць аказаць дапамогу 70 чалавекам. Донарская кроў і яе кампаненты запатрабаваны пры планавых аперацыях, аператыўнай рададапамозе, трансплантацыях органаў і тканак, пры вялікіх аперацыях у кардыялогіі, кардыяхірургіі, анкалогіі, дзіцячай анкагематалогіі.

Постаці

# ЯГО ВЫЛУЧАЛІ СУМЛЕННАСЦЬ, ПРАСТАТА І БЯЗМЕРНАЕ АБАЯННЕ

## Расказваем пра чалавека, які тры дзесяцігоддзі ўзначальваў Чырвоны Крыж

**Сёлета Беларускаму Чырвонаму Крыжу спаўняецца 100 гадоў. Без перабольшання можна сказаць, што пра гэту самую буйную гуманітарную арганізацыю ў нашай краіне ведае кожны, а за час свайго існавання яна дапамагла мільёнам чалавек. Яшчэ ў савецкія часы Беларускі Чырвоны Крыж быў адным з найлепшых у СССР. Падмурак і тагачасная поспеху, а ў многім — і сённяшняга заклаў заслужаны ўрач БССР Уладзімір Іосіфавіч Сёмуха, які ўзначальваў арганізацыю на працягу трох дзесяцігоддзяў. Пра гэтага неардынарнага чалавека мы паразмаўлялі з яго дачкой, Аленай ТАРАСЕВІЧ.**



Нарадзіўся Уладзімір Сёмуха ў 1928 годзе ў Баранавічах. У вялікай і дружнай сям'і было чацвёра дзяцей. Да слова, малодшы брат, Мікалай, розніца з якім ва ўзросце была 20 гадоў, пайшоў па слядах старэйшага і таксама стаў урачом. У 1947 годзе Уладзімір Сёмуха выдатна скончыў Баранавіцкую фельчарска-акушэрскую школу і паступіў на лячэбны факультэт Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута.

— Аднакурснікі — праўда, іх засталося вельмі мала — памятаюць тату не толькі як добрага таварыша і сябра, а таксама як актыўнага ўдзельніка студэнцкай самадзейнасці, — кажа Алена Тарасевіч. — Тата іграў на скрыпцы ў інстытуцкім аркестры. І на апошнім курсе на канцэрце пазнаёміўся з маёй мамай — Кларай Мікалаеўнай Герасімовіч. Гэта было адзінае каханне на ўсё жыццё — разам бацькі пражылі 69 гадоў.

У 1953 годзе пасля заканчэння медыцынскага інстытута Уладзімір Сёмуха быў накіраваны ў апарат Міністэрства аховы здароўя БССР, дзе ўзначальваў галоўнае ўпраўленне лячэбна-прафілактычнай дапамогі насельніцтву.

— У 1955-м у бацькоў нарадзілася першая дачка — мая сястра Святлана, а праз восем гадоў з'явілася я. Нягледзячы на тое што Святлана была татавай любіміцай, ад бацькоў ёй як старэйшай заўсёды больш даставалася за нашы агульныя свавольствы. Увесь вольны ад працы час бацька праводзіў у сям'і, з намі. Ён шмат нам чытаў, стараўся прывіваць любоў да музыкі (сястра іграе на фартэпіяна), спорту, замежных моў. У дзяцінстве мы часта выязджалі на прыроду, дзе тата расказваў нам пра дрэвы, птушак, якіх ён ласкава называў «пічужкі».

У 1960 годзе Уладзіміра Сёмуху абралі старшынёй Цэнтральнага камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа БССР. Ён вялікую ўвагу аддаваў людзям, што трапілі ў цяжкае становішча, папулярызацыі санітарнай культуры, падрыхтоўцы валанцёраў, прыцягненню бязвыплатных донараў, медыка-сацыяльнай дапамозе насельніцтву і іншым надзённым пытанням.

— Міласэрнасць, спачуванне і імкненне па першым пакліку прыйсці на дапамогу — гэта быў лад жыцця, пра які тата з натхненнем любіў успамінаць, — кажа Алена Тарасевіч.

Больш за тры дзесяцігоддзі Уладзімір Сёмуха ўзначальваў Беларускі Чырвоны Крыж. Пад яго кіраўніцтвам грамадская арганізацыя стала адной з самых масавых і запатрабаваных у краіне, а на працягу многіх гадоў увогуле была найлепшай у СССР. Рух донарства (больш за 95 % з іх здавала кроў бязвыплатна), дзве тысячы міласэрных сясцёр, якія дапамагалі інвалідам Вялікай Айчыннай вайны і даглядалі адзінокіх хворых, сандружыны і санпасты на прадпрыемствах — гэта толькі нязначная частка работы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Паралельна Уладзімір Сёмуха працаваў урачом-эндакрынолагам.

— Адметная рыса таты — гэта яго сумленнасць, прыстойнасць, высокая працаздольнасць, настойлівасць у рабоце, прастата і безмернае абаянне. За гэта тату любілі і паважалі ўсе, хто працаваў і жыў побач з ім. Прычым час у таты заўсёды быў правільна структураваны, ён умеў вылучыць галоўнае і дзіўным чынам паспяваў своечасова скончыць намечанае. Тата прытрымліваўся правільнага рэжыму дня, заўсёды своечасова клаўся спаць. Я, калі заседжваюся да ночы над сваімі дакладамі, шкадую, што не атрымала ад яго ў спадчыну гэту рысу, — кажа Алена Тарасевіч.

У 1970—1975 гадах Уладзімір Сёмуха быў камандзіраваны ў Жэневу, дзе працаваў намеснікам Генеральнага сакратара Міжнароднай федэрацыі Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца і кіраваў усёй яе медыка-сацыяльнай дзейнасцю.

— Супрацоўнічаць даводзілася з Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, Міжнародным камітэтам Чырвонага Крыжа, ААН, ЮНІСЕФ і іншымі міжнароднымі арганізацыямі. У таты была фенаменальная памяць, за кароткі прамежак часу ён авалодаў трыма замежнымі мовамі — англійскай, французскай і польскай.

За час работы ў Міжнароднай федэрацыі Уладзімір Іосіфавіч шмат ездзіў — ён наведаў больш чым 30 краін свету падчас міжнародных канферэнцый і сімпозіумаў па пытаннях барацьбы за мір, ліквідацыі наступстваў ваенных канфліктаў, аховы навакольнага асяроддзя, барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі, наркаманіяй і алкагалізмам. У прыватнасці ён падрыхтаваў праграму па барацьбе з халерай у Эфіопіі.

— Па розных пытаннях аховы здароўя і працы Таварыстваў Чырвонага Крыжа тата ездзіў і ў іншыя дзяржавы. Наогул за час работы наведаў больш за 60 краін свету. Нам з сястрой, калі мы былі малыя, з паездак тата заўсёды прывозіў адналькавыя лялькі, але ў розным адзенні. І мы ніяк не маглі іх падзяліць. Сястры заўсёды здавалася, што ў маёй лялькі больш прыгожыя туфлі ці сукенка. Яна даводзіла мяне да слёз, за што ёй даставалася ад бацькоў.

У 1989 годзе Уладзімір Сёмуха быў абраны народным дэпутатам СССР і членам Вярхоўнага Савета СССР, быў намеснікам старшыні камітэта Вярхоўнага Савета СССР па ахове здароўя народа.

— З 1989 да 1992 года тата працаваў у Маскве, у Вярхоўным Савеце СССР на пастаяннай аснове. У той час мы з сястрой ужо былі дарослыя. Я працягнула дынастыю урачоў і, скончыўшы Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, працавала і цяпер працягваю працаваць псіхатэрапеўтам, дацэнтам кафедры псіхатэрапіі і медыцынскай псіхалогіі БелМАПА. А сястра выбрала спецыяльнасць паміж татавай і мамінай (мама ў нас педагог-філолаг) і працуе лагапедам у 20-й дзіцячай паліклініцы Мінска. Тата вельмі любіў дзяцей, а дзеці — яго, таму з бацькамі ў Маскве часта жылі ўнукі — мой сын Антон і дачка сястры Алена. Антон, адзіны хлопчык у нашым родзе, шмат часу праводзіў з дзядулем. І пераняў ад яго педантычнасць і перфекцыянізм. У бацькі на стале заўсёды быў ідэальны парадак, ён акуратна складваў усе рэчы. Так і ў Антона ўсюды ўзорная чысціня, нават у машыне, прычым у любое надвор'е. Ён у многім браў прыклад з дзядулі, увогуле маіх бацькоў называў «мая другая мама» і «мой другі тата».

Нягледзячы на пастаянны цэйтнот у рабоце Уладзімір Сёмуха любіў пісаць, ён аўтар больш чым 80 навуковых публікацый па пытаннях арганізацыі аховы здароўя і працы Чырвонага Крыжа.

Уладзіміру Іосіфавічу прысвоена ганаровае званне заслужанага ўрача БССР, таксама ён узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», двума медалямі і трыма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і іншымі ўзнагародамі.

— Для таты даражэй за ўсе ўзнагароды была людская падзяка і памяць тых, каму выратавалі жыццё бязвыплатныя донары, хто ў немачы і адзіноце атрымаў дапамогу і падтрымку медыцынскіх міласэрных сясцёр, для каго Чырвоны Крыж быў і застаецца сімвалам надзеі. Людзі, якім дапамог Чырвоны Крыж, у пошуку блізкіх (напрыклад, у той час гэта былі людзі, што ваявалі ў Афганістане і прапалі без вестак) дасылалі тату паштоўкі з падзякамі. А ён быў вельмі гуллівы, ад слоў падзякі ў яго адразу выступалі слёзы. З людзьмі, якія цанілі яго падтрымку, заўсёды завязваліся цёплыя адносіны. Ён добра памятаў усе прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, стараўся ўсіх павіншаваць з днём нараджэння.

Сёлета 27 красавіка Уладзіміра Іосіфавіча не стала. Яму было 93 гады.

— Усё жыццё нашага бацькі — гэта сумленнае і бескарыслівае служэнне людзям. Мы з гонарам і любоўю будзем памятаць заўсёды нашага выдатнага тату, дзядулю, мужа і чалавека!

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже имущества ОАО «Чайка» 13 июля 2021 года

| Вид аукциона – открытый | Лот № 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий: здание производственного корпуса с инв. № 400/С-2231; здание административное (здание конторы) с инв. № 400/С-52443; здание склада с инв. № 400/С-128431; здание гаража с инв. № 400/С-67644; здание проходной с инв. № 400/С-128430; здание проходной с инв. № 400/С-129429; здание гаража с инв. № 400/С-128427; здание склада готовой продукции металла с инв. № 400/С-128429; сооружения внешнего благоустройства с инв. № 400/С-128425 и инв. № 400/С-128426; передаточные устройства: участок тепловой сети к административному зданию с инв. № 400/С-128424, участок водопроводной сети к административному зданию с инв. № 400/С-128423; участок канализационной сети к административному зданию с инв. № 400/С-128422; многолетние зеленые насаждения; десять единиц оборудования |
| **Начальная цена продажи** | **1 800 000,00 рублей** (с учетом НДС 20 %) |
| **Кадастровые номера земельных участков и их размеры** | 440100000002001136 площадью 0,7335 га |
| **Месторасположение земельного участка** | **Гродненская область, г. Гродно, пер. Виленский, д. 16** |
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 607300** |
| **Имущественное право земельных участков** | Право постоянного пользования |
| **Сумма задатка** | **54 000,00 рублей** |
| Организатор аукциона: **коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 626055, 626056** | |
| Дата проведения аукциона: **13 июля 2021 года** Время проведения аукциона: **12.00** | |
| Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал** | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117** | |
| Дата и время начала приема документов: **14 июня 2021 года 8.00** | |
| Дата и время окончания приема документов: **7 июля 2021 года 17.00** | |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Возможные условия расчетов по договору купли-продажи недвижимости:

- 100 % предоплата в течение 14 календарных дней со дня заключения договора, передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты полной оплаты стоимости недвижимого имущества;
- 50 % предоплата в течение 14 календарных дней со дня заключения договора, передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты внесения предоплаты; оставшаяся часть стоимости имущества уплачивается равными долями в течение 12 месяцев с даты заключения договора купли-продажи, с возможностью досрочного погашения;
- равными долями в течение 12 месяцев с даты заключения договора купли-продажи, с возможностью досрочного погашения; передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Договор купли- продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адреса сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета: **http://grodno.gov.by**, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»: **http://gcn.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1 (повторный): телятник с инв. № 600/С-118890 общей площадью 1008,3 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000105 площадью 0,8809 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Шершунский с/с, 25, район д. Новый Двор.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электропередачи напряжением свыше 10 кВ, пл. 0,1760 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **90 988,89 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **9 098,88 бел. руб.)**. Начальная цена снижена на 45 %.

**Лот № 2 (повторный): телятник с инв. № 601/С-15309 общей площадью 781,8 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623200000020000001 площадью 0,1897 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Логойский район, район д. Корбачевка.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 47 705,89 бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 4 770,59 бел. руб.). Начальная цена снижена на 20 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в следующем размере: по лоту № 1 – 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения по лоту № 1 были опубликованы в газете «Звязда» от 24.10.2020, 02.12.20, 19.03.2021, по лоту № 2 – 20.01.2021, 19.03.2021.

**Аукцион состоится 13.07.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.07.2021 до 16.00 по указанному адресу в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 017 504-83-58, 029 162-40-72.**

УНН 600068728

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Витко-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ

**(составные части и принадлежности: сарай, уборная), инв. № 640/С-26970 общей площадью 181,4 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006031 площадью 0,1002 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Козинцева-Прокопчика, 1.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 85 800,00 бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 8 580,00 бел. руб.). Начальная цена снижена на 40 %.

*Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».*

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 03.04.2021.

Аукцион состоится **13.07.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 12.07.2021 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8(033) 668 83 17.**

УНП 600043245

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности г. Минска и оперативном управлении Администрации Фрунзенского района г. Минска (продавец)**

**Лот № 1: гараж № 7а с инв. № 500/D-695402, 1986 г. п., 27,7 кв. м, г. Минск, ул. Одоевского, д. 10А, пом. 7А.**
Начальная цена без НДС – 3474,65 руб.

**Лот № 2: гараж № 24а с инв. № 500/D-695403, 1985 г. п., 36,2 кв. м, г. Минск, ул. Одоевского, д. 10А, пом. 24А.**
Начальная цена без НДС – 6989,96 руб.

**Аукцион состоится 16.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1819443, 0919221–0919225.

УНП 100782388

---

**<u>28 июня 2021 года в 15.00</u> в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Вишневка-2010» С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Вишневка-2010»

Регистрация участников внеочередного общего собрания акционеров будет осуществляться 28 июня 2021 года с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский р-н, аг. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 19.06.2021 по 27.06.2021.

УНП 600041880

---

30 июня 2021 года в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О приобретении открытым акционерным обществом «Элегант» акций открытого акционерного общества «Элегант» на баланс Общества.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 13-1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1, 4-й этаж, кабинет директора.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 14.00 до 14.50 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 22 июня 2021 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 10.00 до 11.00 начиная с 20.06.2021 г. по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400078331

---

# Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 13 июля 2021 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Сергея Болгарина, 22 (У-636, микрорайон «Заболоть») 440100000002006946** | 0,0996 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 6 %. Фундаментные блоки железобетонные сплошные. Наружная площадь (площадь застройки): 103 (103) кв. м | 266,06 | 21 487,57 (4 410,84; 17 076,73) | 4 200 |

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; продолжить строительство не позднее одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 13 июля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 14 июня по 7 июля 2021 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: **+ 375 (152) 626055, 626056.** Адрес сайта коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by/**

Абітурыент-2021

# ПРАЦАВАЦЬ І ГАЛАВОЙ, І РУКАМІ

## 15 чэрвеня стартуе прыёмная кампанія ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі

**Сёлета прыём будуць весці 125 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі па больш чым 250 прафесіях. Акрамя таго, адукацыйныя праграмы па падрыхтоўцы рабочых рэалізуе 41 установа адукацыі іншых узроўняў (каледжы, філіялы ВНУ). У структуры прыёму будуць захаваны тэндэнцыі мінулых гадоў: спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі складуць амаль 75 працэнтаў.**

### У ЗВЯЗЦЫ З ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ

Усяго на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 26,7 тысячы чалавек, з іх за кошт сродкаў бюджэту — 26,6 тысячы. Лічбы прыёму ў параўнанні з мінулым годам не толькі не зменшыліся, а, наадварот, крыху падраслі — прадстаўнікі рабочых прафесій заўсёды ў дэфіцыце.

— Установы прафтэхадукацыі працуюць у вельмі цеснай звязцы з арганізацыямі-заказчыкамі кадраў і аператыўна абнаўляюць кваліфікацыі, — падкрэсліла **начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Напрыклад, сёлета распачнецца падрыхтоўка па 135 новых для асобных навучальных устаноў прафесіях і прыпыніцца падрыхтоўка па 150 прафесіях. Мы імкнёмся максімальна наблізіцца да патрабаванняў, якія дыктуе рынак працы: як у колькасным, так і ў якасным плане.

На сённяшні дзень у краіне функцыянуе 51 рэсурсны цэнтр на базе ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Узровень прафесійнай адукацыі павінен адпавядаць узроўню развіцця вытворчасці або апярэджваць яго — менавіта такая ідэя была пакладзена ў аснову іх стварэння. Тут канцэнтруюцца ўсе неабходныя рэсурсы (і матэрыяльныя, і кадравыя, і навукова-метадычныя) для забеспячэння высокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і рабочых для высокатэхналагічных, навукаёмістых, экспартаарыентаваных і імпартазамяшчальных вытворчасцяў. Прычым доступ да дарагога абсталявання маюць навучэнцы з розных навучальных устаноў, дзе рыхтуюць спецыялістаў па аналагічных спецыяльнасцях. Даступнасць забяспечваецца праз сеткавае ўзаемадзеянне ўстаноў прафесійнай адукацыі.

### СТАНДАРТЫ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

Як адзначыла Аляксандра Пятрова, далучэнне нашай краіны ў 2014 годзе да сусветнага руху WorldSkills адкрыла перад сістэмай прафесійнай адукацыі новыя магчымасці. Галоўная мэта WorldSkills — папулярызацыя рабочых прафесій у сучасным грамадстве, у тым ліку праз правядзенне нацыянальных і міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве. У сусветнага руху WorldSkills ёсць дэвіз «Удасканальвай свет прафесійнымі навыкамі».

Кожныя два гады праходзіць сусветнае першынство ў шасці сферах: транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогіі будаўнічай вытворчасці, тэхналогіі вытворчасці і тэхналогіі машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і сацыяльна-бытавое абслугоўванне. Але спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў.

Прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта стандарты заўтрашняга дня. А сусветнае першынство — своеасаблівы выклік для нацыянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі, паколькі патэнцыяльныя інвестары ацэньваюць перш-наперш нашу краіну. Для таго каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуюцца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высокай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць на сучасным абсталяванні.



Фота з сайта worldskills.by

А каб зразумець, наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі беларускіх устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў, трэба выкарыстоўваць міжнародныя індыкатары якасці.

> **«Некаторыя рабочыя спецыяльнасці або ўжо зніклі, або блізкія да знікнення. Замест іх з'яўляюцца іншыя, з прынцыпова новым узроўнем падрыхтоўкі».**

Беларусь паспела ўзяць удзел у трох сусветных чэмпіянатах — у Сан-Паўлу (Бразілія, 2015 год), у Абу-Дабі (ААЭ, 2017 год) і ў Казані (Расія, 2019 год). Дарэчы, на апошнім сусветным першынстве Беларусь у агульнакамандным заліку заняла 15-е месца з 63. Плюс нашы хлопцы і дзяўчаты атрымалі чатыры медалі выдатніка за прафесійнае майстэрства. Беларуская зборная ўдзельнічала ў 33 кампетэнцыях, пачынаючы ад дэманстрацыі кулінарных шэдэўраў і да тэхналогій у будаўніцтве.

### 3 ЛІЦЭЯ — НА АЛІМПІЯДУ

— Многія нашы ўстановы прафесійнай адукацыі з'яўляюцца базай для падрыхтоўкі ўдзельнікаў як нацыянальных, так і міжнародных чэмпіянатаў, — дадала Аляксандра Пятрова. — Таму ў маладых людзей, якія стануць іх навучэнцамі, ёсць магчымасць не толькі атрымаць запатрабаваную на рынку працы прафесію, але і паўдзельнічаць у алімпіядным руху.

Адна з такіх устаноў — **Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 5 транспартнага будаўніцтва.**

— У гэтым годзе мы набіраем 227 чалавек (на базе дзевяці і адзінаццаці класаў), — расказала яго **дырэктар Інеса КУЗЬМІНА.** — У ліцэі рыхтуюць спецыялістаў для будаўнічай галіны, электраманцёраў па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі, электрамантажнікаў па электраабсталяванні, сілавых і асвятляльных сетках, электрагазазваршчыкаў. Сёлета мы крыху павялічылі набор на спецыяльнасці электратэхнічнага профілю, таму што летась яны былі ў абітурыентаў асабліва запатрабаванымі. Дарэчы, маладыя людзі паступаюць да нас па конкурсе сярэдняга бала атэстата. А ўсіх іншагародніх хлопцаў і дзяўчат мы забяспечваем месцам у інтэрнаце.

Як заўважыла Інеса Кузьміна, ліцэй вельмі актыўна ўдзельнічае ў руху WorldSkills, што дае яму шмат пераваг. Так, за пяць гадоў была цалкам абноўлена ўся яго матэрыяльна-тэхнічная база. «Пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў нашы майстры вытворчага навучання разам з навучэнцамі праходзілі стажыроўку ў Швецыі і Фінляндыі. Сёння мы рыхтуемся да ўдзелу ў сусветным чэмпіянаце ў Шанхаі. Гэта вельмі важны момант, бо мы развіваемся і рухаемся наперад. Вельмі важна сёння ўмець працаваць не толькі галавой, але і рукамі, такія спецыялісты востра запатрабаваныя, а па нашых выпускнікоў работадаўцы стаяць у чарзе. У ліцэі ўжо прайшло размеркаванне — ніводны выпускнік не застаўся без рабочага месца».

Да плюсоў навучання ў прафтэхустанове Інеса Кузьміна аднесла таксама бясплатнае харчаванне навучэнцаў, забеспячэнне іх бясплатнай спецвопраткай і бясплатнымі падручнікамі.

### ТЭХНІЧНАЯ ЭЛІТА

У **Каледж сучасных тэхналогій у машынабудаванні і аўтасэрвісе** плануюць набраць каля 300 чалавек. Навучанне тут вядзецца на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Рыхтуюць фрэзероўшчыкаў, аператараў станкоў з праграмным кіраваннем, слесараў па рамонце аўтамабіляў, аўтамеханікаў, наладчыкаў станкоў і маніпулятараў з праграмным кіраваннем, тэхнікаў-мехатронікаў, аперацыйных лагістаў.

— Лічбы набору мы не змянялі, але перанакіравалі вектар нашай дзейнасці ў вобласць машынабудавання, — расказаў **намеснік дырэктара каледжа па вучэбнай рабоце Дзмітрый БУЛАВІЦКІ.** — Дарэчы, на базе каледжа дзейнічае Рэсурсны цэнтр навучання работнікаў машынабудавання і аўтасэрвісу. А ў яго структуры адкрыты адзіны сертыфікаваны ў краінах СНД цэнтр Festo (FACT) па тэхналогіях індустрыі 4.0 і мехатроніцы.

> **«Узровень прафесійнай адукацыі павінен адпавядаць узроўню развіцця вытворчасці або апярэджваць яго».**

Каледж з'яўляецца каардынатарам такіх напрамкаў руху WorldSkills, як мехатроніка, такарна-фрэзерныя работы на станках з лічбавым праграмным кіраваннем і аўтасэрвіс.

Пры навучанні рабоце на станках з лічбавым праграмным кіраваннем навучэнцы ў рэсурсным цэнтры спачатку адпрацоўваюць свае ўменні на камп'ютары, імітуючы апрацоўку дэталі. На экране яны візуальна могуць убачыць, напрыклад, як ламаецца такарны разец, фактычна акунаюцца ў свет віртуальнай майстэрні. У іх ёсць магчымасць пазнаёміцца з канструкцыяй станка з праграмным кіраваннем, так бы мовіць, знутры. Зняўшы віртуальныя ахоўныя прыстасаванні, можна ўбачыць нават больш, чым на рэальным абсталяванні, азнаёміцца з прынцыпамі работы ўсіх асноўных вузлоў станка.

На другім этапе навучання выкарыстоўваюцца сімулятары (трэнажоры): камп'ютарная праграма можа змадэляваць любую аварыйную сітуацыю, і калі навучэнец дапускае памылку, то праграма яму на гэта ўказвае. І толькі потым навучэнцаў дапускаюць у майстэрню з рэальным абсталяваннем. Ёсць і трэці ўзровень — праектаванне, калі спецыяліст павінен напісаць праграму для пэўнай дэталі і зрабіць трохмерны чарцёж. Такім чынам, токар, які працуе на сучасным станку з лічбавым праграмным кіраваннем, у адной асобе і тэхнолаг, і наладчык, і аператар, што кантралюе прыладу.

У многіх краінах свету сёння вядуцца размовы пра перагляд падыходаў да рабочых спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Некаторыя рабочыя спецыяльнасці або ўжо зніклі, або блізкія да знікнення. Замест іх з'яўляюцца іншыя, з прынцыпова новым узроўнем падрыхтоўкі. Цяпер, каб выконваць на вытворчасці спецыяльныя функцыі, рабочаму недастаткова валодаць толькі пэўнымі навыкамі — трэба мець шырокі дыяпазон ведаў у сумежных галінах.

Межы паміж узроўнямі адукацыі размываюцца. Ёсць прафесіі, дзе рабочаму хапае прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але ёсць прафесіі, і іх становіцца ўсё больш, дзе ад рабочага персаналу патрабуецца наяўнасць сярэдняй спецыяльнай і нават вышэйшай адукацыі. Невыпадкова ў многіх кампетэнцыях на чэмпіянаце прафесійнага майстэрства WorldSkills выступаюць студэнты ВНУ і навучэнцы каледжаў.

Прыём дакументаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі праходзіць да 20 жніўня.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

---

Класныя навіны

## Пескаграфія і мультыстудыя

### Цэнтр сучасных методык у дашкольнай адукацыі адкрыўся ў БДПУ

**У ім акумулявана больш як 180 найменняў сучасных сродкаў навучання і ігравога абсталявання, прызначанага для ўсебаковага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Гэта матэрыялы адукацыйных модуляў STEAM-адукацыі для дашкольнікаў: «Эксперыментаванне з жывой і нежывой прыродай», «LEGO-канструяванне», «Матэматычнае развіццё», «Робататэхніка», «Мультыстудыя «Я ствараю свет» і іншыя.**

Яны дазваляюць вырашаць разнастайныя задачы развіцця дзяцей на аснове міждысцыплінарнага і прыкладнога падыходаў. А інтэрактыўная пясочніца ў спалучэнні з інтэрактыўным сталом стварае магчымасці для выкарыстання як навучальных праграм, так і забаўляльных матэрыялаў.

Багата сродкаў для эстэтычнага і творчага развіцця дзяцей у «Творчай майстэрні»: гэта розныя віды тэатра (пальчыкавы, пальчаткавы, ценявы, магнітны), музычныя гульні і цацкі, дзіцячыя музычныя інструменты розных народаў свету. Ёсць магчымасць для пескаграфіі і малявання на вадзе ў тэхніцы эбру.

Таксама значная ўвага ўдзелена сэнсарнаму развіццю дзяцей ранняга ўзросту (уключаючы матэрыялы методыкі Марыі Мантэсоры), фізічнаму развіццю (для гэтых мэт набыта фізкультурна-спартыўнае абсталяванне, балансіры і нейратрэнажоры).

Сродкі навучання ў поўнай меры будуць выкарыстаны ў падрыхтоўцы студэнтаў па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя», пры правядзенні навучальных курсаў для педработнікаў, навучання бацькоў дзяцей дашкольнага ўзросту як у афлайн-рэжыме, так і з выкарыстаннем магчымасцяў сайта цэнтра.

Сайт інтэгруе разнастайныя інфармацыйна-камунікацыйныя рэсурсы цэнтра, на ім створаны магчымасці для дзейнасці сеткавай супольнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі нашай і замежных краін.

Цэнтр створаны па ініцыятыве Міністэрства адукацыі і пры падтрымцы Прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь.

# ПРА БУЛАЧКІ, ПІРАЖКІ І ВОДАР ХЛЕБА,

## або Чаму слойка з джэмам не можа каштаваць чатыры рублі, а даніш — можа

**Каб прыехаць да нашай гераіні на ранішняй электрычцы Мінск—Заслаўе, давялося падняцца даволі рана. А між тым для яе, Ганны Кравец, а восьмай раніцы — дзень ужо ў самым разгары. Ганна прачынаецца ў тры гадзіны, каб паспець напячы хлеб да сняданку не толькі заслаўчан, але і іншых жыхароў прысталічча.**








### «У НАС НЯМА «ХІМІІ»

37-гадовая Ганна — гаспадыня ўласнай пякарні. Кожны дзень да 11.00 ёй неабходна развезці па гандлёвых пунктах каля 500 вырабаў уласнай вытворчасці. Булачкі, смятаннікі, піражкі з джэмам, макам, карыцай, сасіскі ў цесце, круасаны, багеты, хлеб з кменам на заквасцы, «Барадзінскі», з аўсянымі шматкамі, ільняным семем і іншыя духмяныя ласункі... Пекар і яе памочніца Таццяна дастаўляюць усё гэта на ўласных машынах у буфеты лячэбных устаноў Міншчыны — абласную клінічную бальніцу ў Бараўлянах, Цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, бальніцы ў Аксакаўшчыне, а таксама ў Ракаўскую школу. Істотна, што падчас першай ковіднай хвалі пякарня таксама не пераставала працаваць і карміла ўрачоў.

Чым выкліканы такі выбар гандлёвых партнёраў? На думку Ганны Кравец, крамы не асабліва зацікаўлены ў продажы прадукту ўласніка, і лічыць, што ў гандлёвага аб'екта толькі адна мэта — зарабіць.

— У мяне палітыка такая: у бальнічных буфетах — хворыя людзі, ім вельмі важная якасць прадукцыі. Прадавец буфета цэніць свой асартымент, мне з ім прыемней працаваць. Хворыя людзі адчуваюць усякую «хімяціну» і ўсё астатняе, бо самі сядзяць на гэтых таблетках. У нас жа няма «хіміі», у нас натуральная прадукцыя.

Інгрэдыенты заслаўскага печыва беларускія. Джэм, напрыклад, з Гарадзейскага цукровага завода, нагадвае па смаку і кансістэнцыі сапраўднае хатняе варэнне. Мука — з Баранавіч і Маладзечна.

— Мы не дадаём прысадак, і таму мука павінна быць з добрай клейкавінай, мне падабаюцца белізна гэтай мукі і яе якасць, — дадае Ганна і дзеліцца, што ёй прыемна бачыць дзіця з яе смятаннікам у руках альбо назіраць, як чалавек купіў булачку, надломлівае кавалачак і атрымлівае асалоду ад яго духмянасці. Такія звычайныя чалавечыя радасці для пекара — самае сапраўднае шчасце і доказ яго прафесіяналізму.

### «НІКОЛІ Ў ЖЫЦЦІ НЕ БУДУ ПЕКАРАМ!»

Дарэчы, па адукацыі мая суразмоўніца — пекар-кандытар. І ў маладосці ўвогуле не задумвалася, што будзе калі-небудзь сур'ёзна займацца хлебнай справай.

— Я скончыла каледж пры КУП «Мінскхлебпрам» і на сённяшні дзень лічу, што гэта самая лепшая адукацыя: там даюць добрую практыку. Калі пасля заканчэння каледжа я прыйшла дамоў і паклала на стол дыплом, сказала маме, што ніколі ў жыцці не буду працаваць пекарам (*смяецца*).

Ганна гаворыць, што «хлебная» прафесія сапраўды нялёгкая, асабліва цяжка працаваць на хлебазаводзе. Таму стала працаваць супервайзерам у аддзеле рознічных продажаў — цудоўна сябе адчувала ў сферы гандлю спецыямі, чаем і кавай. Тады ў падначаленні дзяўчыны былі людзі і крамы па ўсёй Беларусі. Гэта была перспектыўная работа з добрым заробкам. Аднак лёс вызначыў для яе іншае. Два гады таму заслаўчанка заўважыла, што ў родным горадзе адкрылася пякарня.

— У той перыяд, калі яны з'явіліся, мая машына якраз стала на пераафарбоўванне. Таму я пачала хадзіць на электрычку, каб даязджаць да работы, і якраз праз гэтую пякарню, падводзіла дачку да школы, што знаходзіцца побач. Неяк зайшла, а тут нічога не было — паўпусты хол, звычайны журнальны столік, з якога прадавалі круасаны ды хлеб. І я прапанавала маладым людзям паставіць каваапарат.

Разам з мамай Людмілай Вадзімаўнай Ганна пачала тут свой маленькі бізнес. Вырашыла, што для мамы, якая на пенсіі, гэта добры варыянт. «Лепш працаваць, чым дома сядзець, тым больш унучка будзе пад наглядам», — вырашыла маладая прадпрымальніца. З гэтага ўсё і пачалося. Паступова ў гаспадароў гэтага месца ўсё пачало «затухаць»: асартымент не павялічваўся, новая прадукцыя не з'яўлялася. А на думку Ганны як прадстаўніцы гандлёвай сферы, у такой справе папаўненне так званага гандлёвага партфеля — неабходная рэч. Тады яна і прапанавала выкупіць гэты бізнес. Спачатку было набыта 50 %, пасля — 25 % і яшчэ 25 %. Праз год, калі набылі барную стойку, жанчыны сталі ўладальніцамі ўсёй пякарні.

> **«Нельга дома вось так проста ўзяць і пачаць пячы хлеб. Вы павінны быць упэўненыя, што зрабілі ўсё правільна, па рэцэпце».**

— Усё, што тут ёсць, — печы, стойка, цестамес, раскатка — належыць нам. Калі б яшчэ памяшканне было нашае! — з усмешкай дзеліцца Ганна. — Відавочна, што працэс тут быў неналаджаны. Ранейшыя гаспадары не разбіраліся, што такое хлебапячэнне.

Цяпер у заслаўскую прыватную пякарню людзі прыходзяць з сямі раніцы. Частуючы мяне гарачай булачкай з гарадзейскім джэмам і духмянай кавай, Ганна Кравец расказвае пра сваіх сталых наведвальнікаў. Адна пакупніца прыходзіць самая першая. Гаспадыня старанна ўпакоўвае для яе заказанае ў каробачку, бо гарачае немагчыма несці ў пакеце. А тая фатаграфуе свой сняданак — з прыгожымі булачкамі ці круасанамі — і выкладвае фота ў Instagram. Па суботах, расказвае пекар, да іх заязджаюць дачнікі. Забягаюць і школьнікі, бо побач дзве школы — агульнаадукацыйная і мастацкая. Дарэчы, давялося ўбачыць і дачушку Ганны — Софію, якая зайшла падчас нашай сустрэчы на работу да мамы. Аказваецца, карціны, якія ўпрыгожваюць інтэр'ер памяшкання, — яе малюнкі: дзяўчынка займаецца ў мясцовай мастацкай школе. Сапраўды, гэта першае, на што я звярнула ўвагу, калі трапіла да Ганны. У яркіх колерах дзіцячых твораў бачыцца любоў да роднага горада. Дарэчы, гаспадыня пякарні любіць запрашаць мясцовых дзетак да сябе на майстар-класы — вучыць іх выпякаць піцы і іншыя нескладаныя мучныя вырабы.

Пакуль знаходзілася ў якасці госці, убачыла натуральны працэс работы Ганны: яна сама абслугоўвала пакупнікоў, якія прыходзілі кожны па сваё — хто па моцную каву перад работай, хто — па булачкі са згушчонкай, а некаторыя нават не казалі, па што прыйшлі, — Ганна ўжо ведала, які любімы мучны выраб вынесці для наведвальніка з пякарскай залы. І што здзівіла, з кожным пекар знаходзіла тэму для гутаркі. Акрамя таго, гаспадыня яшчэ паспявала сачыць за вырабамі, што выпякаліся ў печы. Гледзячы на нязгасны аптымізм і прыродажаную жвавасць маёй гераіні, я спытала, ці лічыць яна сябе лідарам.

— Не ведаю, не мне меркаваць. Я проста сябе не магу нічога сказаць, — сціпла адказала Ганна і прадоўжыла аповед пра свой звычайны графік. — Я а трэцяй гадзіне ўстаю. Каб выспацца, мне трэба шэсць гадзін. У мяне ўжо арганізм прызвычаіўся. Незалежна ад абставін, я кладуся спаць а восьмай гадзіне вечара. Перад гэтым я кантралюю дзіця апошні раз, а пасля яна самастойна кладзецца. Да гэтага часу ўжо зроблены ўрокі, застаецца толькі дэсерт ці кефір на ноч, і ўсё. Дачка Сафія ўсё робіць сама. З трох гадзін я ў пякарні, замешваю цеста. Пачынаем увесь працэс работы. Таццяна (паказвае на жанчыну ў пякарскай форме) — мая памочніца і мой намеснік, дарэчы, педагог з дваццацігадовым стажам.

Пякарня Ганны Кравец складаецца з трох чалавек — яе, памочніцы Таццяны і начнога пекара Ірыны. Па словах гаспадыні, хлеб — гэта доўгі працэс, бо ён рыхтуецца толькі гадзіны тры. Плюс пасля выпякаецца яшчэ тры гадзіны, потым прастойваецца, затым яго трэба ўпакаваць. Начны хлебны пекар не толькі выпякае, ён заводзіць і закваскі, і рошчыну.

— Ёй падабаецца працаваць ноччу (пра пекара Ірыну), бо гэта — своеасаблівае таінства. Яна нават не любіць, калі я прыходжу, таму стараюся не ўмешвацца. Дадому Ірына ідзе дзесьці ў дзве гадзіны ночы. Пасля прыходжу я. Гадзіну абстаўляванне адпачывае. Мы завяршаем а 9-10-й, — расказвае Ганна.

### ФОРМУЛА ХЛЕБА

Пекар Кравец не есць «чужы» хлеб — харчуецца сваім. У яе сям'і кожны есць свой хлеб: мама — «Барадзінскі», бездрожжавы белы ці зерневы.

— Для сябе раблю «Вясковы» хлеб па французскай тэхналогіі на малочнай заквасцы.

— А што наконт безглютэнавай прадукцыі? — пытаюся я.

— Для таго каб рабіць безглютэнавую прадукцыю, неабходна мець цэх, дзе ў паветры адсутнічае нават водар дражджэй. То-бок гэта ўвогуле трэба адысці ад мукі. Тады будзе сто працэнтаў безглютэнавая прадукцыя. Калі пякарня вырабляе і тое, і тое — то вас проста надураюць. Калі кажуць, што хлеб на заквасцы больш карысны, чым хлеб на дражджах, — гэта маркетынгавы ход. Гэта два розныя смакі. Любыя дрожджы пры 50 градусах знішчаюцца — што дражджавыя, што заквасачныя. Яны ўсе розныя: у іх розныя від, структура. Але і той, і той хлеб карысны. А вось дамашняя перазакісла закваска можа прыйсціся не на карысць вашаму арганізму. Нельга дома вось так проста ўзяць і пачаць пячы хлеб. Вы павінны быць упэўненыя, што зрабілі ўсё правільна, па рэцэпце.

### ЯКІ ХЛЕБ НАЙЛЕПШЫ?

— Які хлеб для мяне найлепшы? Няма такога. Нельга вылучыць найлепшага сярод сваіх уласных дзяцей. Яны ўсе для цябе любімыя. Так і хлеб. Ён у мяне розны — ёсць пшанічны, ржаны, з семкамі сланечніка, ржаны на заквасцы, з кменам, яны ўсе адрозніваюцца, і ў іх зусім розныя смакавыя якасці.

На паліцах у гандлёвым аддзеле пякарні даволі вялікі асартымент. Ганна раіць звярнуць увагу на хлеб з аўсяных шматкоў грубага памолу, у ім гэтага інгрэдыенту каля 70 %, таму ён вельмі карысны. Увогуле, для пакупнікоў, на яе думку, павінен быць шырокі выбар, каб кожны змог падабраць нешта сваё.

У мучной вытворчасці заслаўскай уласніцы да прадукту адносяцца беражліва. Калі застаецца нераспрададзеная выпечка — брыгада жанчын вырабляе сухарыкі. Выраб можа быць і з джэмам, і з макам. Спачатку будучая смаката наразаецца, высушваецца, для яе робіцца адмысловы сіроп, якім будучыя сухары паліваюць і пасля запякаюць.

— У Мінску хлеб, які называюць крафтавым, альбо ручной работы, каштуе ад пяці рублёў і вышэй. Для мяне было заўсёды незразумела, як можна паставіць на хлеб такую высокую цану, — здзіўляецца мая гераіня. — Калі пазіцыянуюць, што там няма дражджэй, то тады ў складзе застаюцца толькі мука, вада і... усё. Чаму ж хлеб можа каштаваць так дорага? Пасля я знайшла адказ на сваё пытанне. Таму што — модна (*усміхаецца*). Слойка з джэмам не можа каштаваць чатыры рублі, а даніш — можа. Даніш — гэта такая ж трохвугольная слойка, — тлумачыць бізнесвуман.

Аднак у пекара Кравец таксама маецца дарагі хлеб, ён каштуе шэсць рублёў, важыць 500 грамаў, аднак у ім утрымліваюцца малако, дрожджы... і робіцца ён трыма спосабамі — рошчына, закваска і жывое закісанне. Гатуецца такі хлеб больш за 12 гадзін і стаіць доўга пры ўключанай электраэнергіі. Калі паставіць яго на масавую вытворчасць, лічыць Ганна, ён не будзе каштаваць шэсць рублёў. І калі рабіць яго не тры штукі, як робіць яна для адпрацоўкі рэцэпта, а 20, то кошт знізіцца да трох рублёў. Вось тлумачэнне высокага кошту такога хлеба ў вытворчасці майстра.

### ГРОШЫ — НЕ САМАЕ ГАЛОЎНАЕ

Для маёй гераіні грошы — не самае галоўнае ў жыцці. Апошняя работа Ганне прыносіла задавальненне, нават калі яна прыходзіла дамоў і клалася спаць з высокім ціскам, дзейнасць задавальняла. Тады яна падпарадкоўвалася непасрэдна генеральнаму дырэктару, а ён быў чалавекам ваенным. Начальнік тлумачыў, што калі заробіць ён, заробіць і яна. Гэтую формулу заслаўчанка цяпер выкарыстоўвае і ў сваёй пякарскай справе. Аднак не заўсёды атрымліваецца данесці гэта як след, таму яна працуе сама і ўся адказнасць на ёй. «У мяне няма бухгалтара, гэта нерэнтабельна пакуль. Па візіцы рахунку, падаткі падлічыць, крэдыт заплаціць ды з пастаўшчыкамі дамовіцца — гэта не самае складанае».

Каля трох-чатырох гадзін, бывае, каля пяці вечара яна дома. Руплівіца, на здзіўленне, працягвае шчыраваць на асабістай кухні, прычым з задавальненнем. Ганна сцвярджае, што гатаваць піражкі, блінцы для сямейнікаў ёй не надакучвае ніколі. У вольны час, якога так мала ў яе цесным графіку, любіць павудзіць на рэчцы. А яшчэ яна абажае сваіх хатніх гадаванцаў, якіх шасцёра — тры сабакі і тры каты. Для Ганны Кравец — лічу, усё ж такі лідара па жыцці, адшукаць у сутках 25-ю гадзіну, здаецца, не складае ніякіх цяжкасцяў.

У канцы размовы я спытала пра рэнтабельнасць яе прадпрыемства. Уласніца адказала, што яны самаакупляюцца — гэта на сёння галоўнае. Аднак для таго, каб вярнуць усю тую суму, якую ўклала, ёй спатрэбіцца гадоў пятнаццаць. «Напэўна, — кажа жанчына, — гэта маё хобі, якое дае магчымасць не толькі ўтрымліваць маю сям'ю, але і атрымліваць асалоду».

**Надзея ЗУЕВА.**

*г. Заслаўе.*

# Музыка, родныя словы і іншае...

## Як прайшоў фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне

**Тыдзень таму «Звязда» анансавала фестываль беларускай песні і паэзіі, які павінен быў адбыцца 11 і 12 чэрвеня ў Маладзечне. Свята праходзіць ужо дваццаты раз. Відавочна, што гэтага часу было дастаткова, каб сфарміраваць аблічча фестывалю. Напэўна, тыя, каму ўдалося трапіць 4—6 чэрвеня 1993 года на гарадскі стадыён Маладзечна, дзе адбываўся I Рэспубліканскі фэстываль песні і паэзіі, ніколі не забудуцца, як у 21.30 у знак пачатку на гледачоў высыпалі з верталёта паўтары тысячы гваздзікоў і руж... Якіх толькі сюрпрызаў не было за час існавання фестывалю! Колькі выдатных песень прагучала, колькі спевакоў пачалі адсюль шлях на вялікую сцэну, колькі прэзентавалася песень, якія сталі ўжо класікай!**

**Мы завіталі ў Маладзечна, каб паглядзець, як адбываўся фестываль дваццаты раз.**




**Ніколь ФУРГАЛ са спецыяльным прызам імя Уладзіміра Мулявіна — хрустальнай гітарай.**

### ГОРАД З РОЗНЫХ БАКОЎ

Фестываль падараваў магчымасць падрабязна пазнаёміцца з горадам. Канцэртная праграма праходзіла ў розных установах Маладзечна. Так, у нас атрымалася трапіць у музычны каледж імя Міхала Клеафаса Агінскага. Народны духавы аркестр каледжа выступіў з праграмай «Музыка беларускіх кампазітараў». На канцэрце прагучалі песні, якія хоць і маюць аўтараў, але ўжо даўно лічацца народнымі. Прызнаюся шчыра, я ніколі не магла ўявіць, што духавыя інструменты могуць гучаць настолькі пранікнёна. Больш за ўсё запомніліся дзве кампазіцыі: «Маленькі прынц» і «Беларусь» Уладзіміра Мулявіна.

На Цэнтральнай плошчы горада ўсе дні нешта адбывалася: то канцэртная праграма «Маладзечна — творчы горад», то парад духавых аркестраў «Фанфары Міншчыны», то акцыя дзіцячых калектываў Маладзечанскага раёна «Колер маёй краіны». Арганізатары не забыліся і пра парк Перамогі, у ім размясцілася канцэртна-забаўляльная пляцоўка «Тэрыторыя дзяцінства».

У мінулую паездку я звярнула ўвагу на Касцёл Святога Юзафа. Будынак выглядае стрымана і нават урбаністычна. Пабудаваны ў канцы XX стагоддзя, ён лічыцца ўзорам культавага збудавання ў сучасным стылі. На жаль, тады трапіць унутр не атрымалася. Але цяпер, падчас фестывалю, касцёл не толькі працаваў, але і стаў пляцоўкай для правядзення канцэрта беларускай духоўнай музыкі. Выканаўцамі былі ўдзельнікі харавога ансамбля Concertino, які спецыялізуецца на сучасным выкананні рэлігійнай музыкі. У касцёле спевы а капэла гучалі асабліва: гукі даляталі да самых далёкіх закуткоў.

У дні фестывалю Маладзечна стаў турыстычным. Цэнтральная плошча, гарадскі парк, каледжы ды кінатэатр — усё было задзейнічана. Утылітарныя функцыі горада адышлі на другі план, галоўным жа стала культурнае напаўненне.



**Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл ФІНБЕРГ.**

Нельга не сказаць некалькі слоў аб тэме свята. «Маладзечна-2021» быў прысвечаны адразу дзвюм тэмам: юбілею фестывалю, а таксама Году народнага адзінства. Менавіта таму падчас гала-канцэрта «Маладзечна — насустрач шлягерам» быў арганізаваны экскурс у гісторыю форуму: на сцэне амфітэатра з двух бакоў стаялі сталы, за якімі сядзелі знакамітыя кампазітары і артысты, удзельнікі фестывалю розных гадоў. У закрыцці фестывалю прынялі ўдзел знакамітыя беларускія ансамблі, якія сталі ўжо своеасаблівым брэндам: «Верасы», «Песняры» і «Бясёда». На канцэрт завіталі і вядомыя поп-выканаўцы — Алёна Ланская і Аляксандр Саладуха, чые галасы шмат разоў гучалі на маладзечанскім фэсце.

### СВЯТА ВУЛІЦ

Каб трапіць у Палац культуры, трэба прайсці па пешаходнай вуліцы імя Сяргея Прытыцкага. Некаторыя месцічы называюць яе Брадвеем. Напэўна, з-за яе шырыні і прыгажосці. Там сканцэнтраваны асноўныя, неабходныя кожнаму гораду, будынкі. Але, акрамя тыповых магазінаў, пошт і банкаў, на маладзечанскім ёсць і сапраўдная цікавінка — кінатэатр «Радзіма», пабудаваны ў 1946 годзе, увасабленне архітэктуры мінулай эпохі. Чырвоны надпіс, выкананы ў рэтра-стылі, прыцягвае погляд. Дворыкі, якія адкрываюцца ў закутках, і маладыя, свежыя дрэўцы робяць пешаходку ўтульнай і ціхай.

А цяпер уявіце: прыгожая, па-беларуску чыстая, сонечная вуліца невялікага мястэчка. І тут яна запаўняецца мужчынамі ў рознакаляровых кашулях, якія спяваюць у мікрафоны... Мне нават падалося, кожны з іх думае, што падобны да Стаса Міхайлава. У шматлікіх шапіках прадаюцца цацкі: чамусьці найбольшую папулярнасць займелі коцікі і дэльфіны. Таксама даволі часта сустракаецца... авакада.

Беларускія сімвалы выкарыстоўваюцца самымі рознымі спосабамі. Можна набыць кубкі з буслямі, кубкі са збожжам, нават кубкі з выявай рагачоўскай згушчонкі. Кнігі, магніты, кепкі ды майкі — такі ажыўлены гандаль сувенірамі, быццам трапілі не на паэтычна-музычны фестываль ў рэгіянальны беларускі горад, а на курорт у разгар сезона.

### ПАМЯЦЬ ПРА МІНУЛАЕ

Нарэшце я трапляю ў Палац культуры. Менавіта тут асноўная дзея фестывалю. Да ўрачыстага адкрыцця яшчэ шмат часу, а зараз ідзе трэці этап Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні. Відаць, што ўдзельнікі стараюцца і хвалююцца. Першая песня прысвечана Вялікай Айчыннай вайне, другая — Беларусі, трэцяя — нашай прыродзе. І так па крузе.

Тут можна паразважаць пра разнастайнасць рэпертуару... Мы ўжо звярнулі ўвагу на тое, што фестываль праводзіцца дваццаты раз: за гэты час можна выпрацаваць кірунак на эксперыменты, пошук цікавасцяў. Але часам складалася ўражанне, што тэмы песень, самі выступленні, нават сцэнаграфія не даюць уяўлення аб тым, у які годзе гэта адбываецца: ці то ў 1980-м, ці то ў 2020-м. Маркеры сучаснасці адсутнічаюць. Шкада, але маладую публіку гэтым наўрад ці прывабіш.

Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні атрымала Ніколь Фургал. Ёй жа ўручылі спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна — хрустальную гітару. Ніколь — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, зараз яна — салістка шоу-групы «Со-Ні-Ка» пры аб'яднанні «Ветразь» Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Дзяўчына адзначыла:

— Я вельмі ўдзячная бацькам і настаўнікам.



Выкладчыкі, якія вучылі мяне з дзяцінства, далі многае.

А вось тое, што прымусіла застацца да канца конкурсу і атрымліваць асалоду, — Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі. Дзякуючы яму была створана асаблівая, трапяткая атмасфера. Нават калі песні ў сваіх тэмах паўтараліся, ратавала выдатнае музычнае выкананне. Мастацкі кіраўнік аркестра народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг быў старшынёй журы конкурсу маладых выканаўцаў.

— Усё, што рабілася на конкурсе, — невыпадкова. Выканаўцы ўжо былі праслуханы, і мы ведалі, якія ў іх ёсць дачыненні да беларускай песні. Гэта для нас галоўная справа: трэба выявіць новых людзей, якія стануць пераможцамі ў міжнародных конкурсах. Родная Беларусь гэтага заслугоўвае! — адзначыў маэстра.

### ШТО Ў ВЫНІКУ?

«Маладзечна-2021» пазіцыянуецца як фестываль нацыянальнай песні і паэзіі. З песняй усё добра: пры ўсіх заўвагах ёсць і выдатнае выкананне, і сучасныя падыходы. А што з паэзіяй, якая таксама мусіць быць гаспадыняй на свяце? Безумоўна, тут гучаць песні на словы класікаў беларускай літаратуры, якіх немагчыма абмінуць: Коласа, Купалы, Багдановіча. Ёсць фальклор, які з'яўляецца асновай усёй культуры і таксама патрабуе ўвагі і сучаснага пераасэнсавання. Наконт паэзіі, якая ствараецца зараз: хацелася б большай разнастайнасці імён, тэм, паэтычных форм. Выдатна, што музычна-паэтычная гасцёўня «Святло Радзімы. Радасць Перамогі» сабрала ўдзячных слухачоў. Але чаму б са сцэны не гучаць і вершам паэтаў-эксперыментатараў, папулярных у моладзі? Як можна разважаць аб сучасным культурным працэсе, калі тэмамі абраны толькі прырода ды вайна? Бясспрэчна, гэта важна. Але існуе яшчэ вялікі пласт праблем ды пытанняў, якія патрабуюць абмеркавання з дапамогай мастацтва.

Вялікай перавагай фестывалю з'яўляецца падтрымка народнай культуры. На вуліцах горада размясціліся стэнды гарадоў Мінскай вобласці. Можна было прыняць удзел у гульні, каб лепш пазнаёміцца з асаблівасцямі Салігорска. Дзяўчына ў блакітнай сукенцы прадстаўляла горад Чэрвень. Каля стэнда Бярэзіншчыны дзядуля ў нацыянальным касцюме стругаў велізарную лыжку. І ўсяго дня не хапіла б, каб падлічыць усе даматканыя ручнікі ды вязаныя цацкі, якія прадавалі бабулі.

Фестываль існуе, і нават паспяхова. Вялікая заслуга арганізатараў, што ён адбыўся ў наш няпросты час. Тое, што неабходна шукаць новыя напрамкі і імёны, мяняць фарматы і падыходы, зразумела ўсім, безумоўна, так і будзе. А пакуль падзякуем «Маладзечну-2021» за гасціннасць.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БелТА.**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Борисовский завод
«Автогидроусилитель» (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже одним лотом
имущества в составе:**

• **ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНЫЕ ПОДЪЕЗДНЫЕ ПУТИ** *(составные части и принадлежности: верхнее строение железнодорожного пути, балластная призма, подрельсовые опоры, рельсы, стрелочный перевод, земляное полотно)*, **инв. № 610/С-60469, протяженность 4048,7 м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000566 площадью 3,1241 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов в районе производственной площадки № 2.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 кВт, пл. 1,3152 га.*

• **ЗДАНИЕ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ ПЕРСОНАЛА Ж/Д ВЕТКИ** *(составные части и принадлежности: сарай)*, **инв. № 610/С-58900, общей площадью 122,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 640400000014000507 площадью 0,2392 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Чапаева, 67.**

Начальная цена объектов с НДС (20 %) **– 675 342,42** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**67 534,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **19.07.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.07.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (029) 124 85 79.**

УНП 600009233

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов
Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 12**

**Административное здание** (общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1244** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов административного назначения – для содержания и обслуживания административного здания

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 095 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 16.07.2021 в 14.00.** **Окончание торгов: 16.07.2021 в 15.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.07.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие**
## «Могилевское отделение БелТПП»
**20 июля 2021 в 14.00**
**проводит торги по продаже следующего объекта.**

**ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 723/С-10440 площадью – 544,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – арочник, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724683604301000055 по адресу: Могилевская обл., Мстиславский р-н, Подсолтовский с/с, д. Нестерово, ул. Советская, 19А.**

Начальная цена продажи лота № 1 составляет без учета НДС (20 %): 6700,00 (шесть тысяч семьсот белорусских рублей 00 копеек), задаток: 670,00 (шестьсот семьдесят белорусских рубля 00 копеек).

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Натопа-Агро», 213481, Мстиславкий р-н, Могилевская обл, аг. Подсолтово, тел. для осмотра объектов продажи (8-02240) 53-115.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1 к. 203, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность – представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП», р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся в 20 июля 2021 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 19 июля 2021 до 12.00.

**Регистрация участников торгов 20 июля 2021 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375 0296927492 (А1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: www.mogilevcci.by.

---

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего**

## РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Арендная плата, баз. ар. величина | Срок договора аренда |
|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ: «Здание котельной» с составными частями по адресу: Брестская область, г. Брест, ул. Шоссейная, 14/3 (инвентарный номер по ЕГРНИ 100/С-42071) площадью: 95,5 кв. м (здание котельной), 156,0 кв. м (плитка тротуарная), 8,41 кв. м (ворота), 152,52 кв. м (забор), 4,9 кв. м (труба дымовая)** | 1 765,31 | 176,53 | 106,45 | 5 (пять) лет |
| **Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | | | |
| **Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245 | | | | |
| **Аукцион состоится 15 июля 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** | | | | |
| Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162)-40-87-01, 40-87-02 | | | | |
| **Последний день приема заявлений – 14 июля 2021 г. до 17.00** | | | | |
| Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **(https://au.nca.by/auction/6113)** | | | | |

---

**Информация о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже изолированного помещения РУП «Белпочта»**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Лот № 1:** Изолированное помещение с инв. № 200/D-124676 площадью 627,1 кв. м, расположено на 1-м и 2-м этажах по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленина, 52А-2, наименование – производственное помещение, назначение – помещение многофункциональное. **Обременение:** договоры аренды № 70-2017 от 10.07.2017 сроком по 09.07.2022, № 9-2017 от 07.03.2017 сроком по 06.03.2022, № 610 от 06.10.2020 сроком по 05.10.2025. **Нач. цена**: 87 800,00 бел. руб. без НДС. **Дата, время и место проведения аукциона: 14.07.2021 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 11.06.2021 на сайте Государственного комитета по имуществу http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 6038), на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/.

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Боровой 2-й, 13** и земельный участок | 140100000001023226 | 0,1024 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **89 965,14** | 17 900,00 | **2 809,32** | 0,0001 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0011 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1024 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| 3 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Нестерчука, 97** (площадь застройки 129 кв. м, готовность 6 %) и земельный участок | 140100000001023280 | 0,1040 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **33 344,06** | 6 600,00 | **2 733,83** | 0,0045 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0023 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1040 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **2 900,00 руб.** |

**Организатор аукционных торгов –**
КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»
г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон: 53 81 92

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 09.07.2021 г.**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 15 июля 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.
Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 15.06.2021 г. до 16.00. 09.07.2021 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.
Контактный телефон: 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# ЛАВІ ХВАЛЮ, але не зламай галаву

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускія пляжы гатовы прыняць адпачывальнікаў. У краіне функцыянуе 431 пляж (з іх 21 — у Мінску). Усе пляжныя зоны бяспечныя, дно вадаёмаў абследавана вадалазамі, на кожным пляжы ўстаноўлены буі, а таксама папераджальныя таблічкі і інфармацыйныя стэнды, выратавальныя станцыі аснашчаны ўсім неабходным — моцнымі катарамі, сучасным выратавальным і вадалазным рыштункам, укамплектаваны прафесійнымі супрацоўнікамі.

— Адпачынак немагчымы без адпаведнай інфраструктуры, — падкрэслівае **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства выратавання на водах» Анвар ІГАМБЕРДЗІЕЎ.**

Пляжы абсталяваны з улікам розных інтарэсаў і патрэб адпачывальнікаў: ёсць веладарожкі, дзіцячыя і назіральныя пляцоўкі, кафэ, шэзлонгі, альтанкі, можна ўзяць напракат лодкі і катамараны. Устаноўлены кабінкі для перадзявання і санвузлы.

У сталіцы гэтым летам будзе працаваць інклюзіўная пляжная зона, распавёў **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах Дзмітрый СТАСЕЛЬКА.** Размешчана яна будзе на тэрыторыі пляжа № 2 ў Драздах. Крокі ў гэтым кірунку рабіліся і раней — напрыклад, на пляжы № 1 Цнянскага вадасховішча зона адпачынку абсталявана з улікам патрэб людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, а на пляжах 8 і 9 на Мінскім моры ёсць спецыяльныя кабінкі для перадзявання інвалідаў-калясачнікаў. Але месца для бяспечнага купання людзей з асаблівасцямі пакуль не было.

— Інклюзіўная зона адпачынку будзе ўключаць у сябе купальню, абсталяваную адмысловымі пандусамі і турнікетамі, і месцы для перавадзявання інвалідаў-калясачнікаў, — кажа Дзмітрый Стаселька. — Будзе і пад'язная дарожка да вады. Побач, у непасрэднай бачнасці, размешчана выратавальная станцыя. Месца выбрана зыходзячы з меркаванняў лагістыкі: сюды можна без праблем дабрацца з любога пункта горада.

Словам, адпачывальнікам будзе камфортна. Застаецца толькі выконваць меры асабістай бяспекі на вадзе, кажуць ратавальнікі.

## ДЗЕ КУПАЦЦА БЯСПЕЧНА?

У купальны сезон, распавялі супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах, штогод гіне каля 110 чалавек. Летась гэтая лічба склала 107 чалавек, пазалетась — 105.

— Гібель людзей на вадзе ўзрастае ў пачатку купальнага сезона, — падкрэсліў Анвар Ігамбердзіеў.

На сённяшні дзень актыўна працуюць 66 выратавальных станцый і 148 пастоў Таварыства выратавання на водах (100 пастаянных, астатнія — сезонныя). Але гарантаваць бяспеку на абсалютна ўсіх вадаёмах краіны ратавальнікі не ў сілах.

— 90 % людзей гіне ў месцах, непадкантрольных таварыству, — адзначае кіраўнік арганізацыі. — І часцей за ўсё няшчасныя выпадкі на вадзе адбываюцца ў забароненых для купання месцах.



Дзяжурны медработнік Ірына ХАЛЬЧЭНЯ паказвае на трэніровачным манекене, як праводзяцца рэанімацыйныя мерапрыемствы, калі пацярпелага дасталі з вады.

Сёлета да цёплага сезона па ўсіх берагах акваторый выстаўлены знакі «Месца для купання», «Купанне забаронена», на берагах вадаёмаў устаноўлены стэнды з інфармацыяй аб тэмпературы вады і правілах бяспекі пры купанні. Некаторыя пляжы на Мінскім моры радыёфікаваныя — з гучнагаварыцеляў адпачывальнікам на дзвюх мовах, рускай і англійскай, нагадваюць правілы бяспекі на вадзе. Супрацоўнікамі таварыства штодня праводзяцца рэйды.

— Хацелася б падкрэсліць: дазволенымі для купання месцамі з'яўляюцца толькі пляжныя зоны. Там вы абароненыя, — кажа Дзмітрый Стаселька. — Важна разумець: радыус дзеяння выратавальнай станцыі — 1200 метраў. Купаючыся ў іншых месцах, вы рызыкуеце жыццём.

Купаючыся ў неналежных месцах або заплываючы за буйкі, чалавек падвяргае сябе не толькі небяспецы патануць — ёсць яшчэ верагоднасць загінуць ад сутыкнення з маламерным суднам.

— Суднаўладальнікі ажыццяўляюць праход па воднай роўнядзі і не разлічваюць, што ў месцах, не прызначаных для купання, у вадзе будуць людзі. Гэта можа прывесці да трагедыі, бо сучасныя судны (яхты, маторныя лодкі, гідрацыклы) развіваюць вялікія хуткасці, — адзначае **намеснік начальніка ДУ «Дзяржаўная інспекцыя па маламерных судах» Юрый АЛЯКСЕЕНКА.**

## НЕ ЗАПЛЫВАЙЦЕ ЗА БУЙКІ!

На жаль, менталітэт нашых грамадзян часам такі, кажуць ратавальнікі, што калі яны бачаць прадстаўнікоў Таварыства выратавання на водах, то ў забароненых месцах не купаюцца. Ратавальнікі праехалі — усё, вольніца. Характэрна, што з усіх патанулых з пачатку гэтага года (а гэта 91 чалавек) 23 % (21 чалавек) знаходзіліся ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення.

— Чалавек парушае зону купання, гэта бачыць вахтавы, і мы падыходзім да парушальніка на катары. Гэта можа быць, напрыклад, чалавек у нецвярозым стане, які вырашыў такім чынам скараціць дарогу, пераплыўшы вадаём. Часам ён плыве ў адзенні і ў абутку, — расказвае **дзяжурны матрос выратавальнага паста Таварыства выратавання на водах Савецкага раёна г. Мінска Рустам ЧАРНАВОКІ.** — Ён плыве з апошніх сіл, і, бачачы, што прыйшла дапамога, тут жа сыходзіць пад ваду. Мы адразу паднімаем такога чалавека, гэта ў нас ужо адпрацавана: адзін выкідвае якар, а двое кідаюцца да тапельца. Выцягваем і чуем: «Я не прасіў вас мяне ратаваць, я даплыў бы!» Гэта самы распаўсюджаны адказ.

Купанне ў забароненых месцах можа пацягнуць за сабой штраф да трох базавых. Але на першы раз ратавальнікі звычайна парушальніку даруюць і не выклікаюць міліцыю.

— Спадзяёмся, што людзі зразумеюць і больш парушаць не будуць.

Уласна кажучы, выпісваць штрафы — гэта кампетэнцыя міліцыі, ратавальнікі толькі папярэджваюць. Ну і ратуюць, зразумела. З пачатку бягучага года прадстаўнікамі таварыства выратаваны 80 чалавек па краіне, з іх 13 — непаўналетнія. Папярэджаны за парушэнне правілаў аховы жыцця людзей на водах 9925 чалавек, у тым ліку 854 непаўналетнія. Але 12 дзяцей з пачатку гэтага года загінулі на вадзе — прадухіліць трагедыю не ўдалося.

— У гібелі маленькіх дзяцей на вадзе звычайна вінаватыя дарослыя, якія паводзяць сябе бесклапотна і пакідаюць малалетніх каля вады без належнага нагляду, — падкрэслівае старшыня рэспубліканскай выратавальнай арганізацыі. — А для 10-12-гадовых і крыху старэйшых галоўная прычына гібелі ў вадзе — бравада.

Быў выпадак у Віцебскай вобласці: дзядуля сам паказаў унукам невялікае азярцо і зрабіў для іх плыцік. І вадаём маленькі, і глыбіня яго ўсяго метр семдзесят, але дзеці вырашылі паплаваць на плыце адны і загінулі.

А што датычыцца бравады, то да яе схільныя не толькі падлеткі, але і, здавалася б, дарослыя людзі, распавядаюць ратавальнікі. Класічны прыклад: пасля лазні кампанія хлопцаў вырашыла паспаборнічаць, хто далей праплыве пад вадой. Нырнулі чацвёра, а на паверхню выплылі трое... Зусім нядаўні выпадак: у невялікім мястэчку гулялі вяселле. Жаніх ад паўнаты пачуццяў нырнуў з дамбы. У выніку дзяўчына, ледзь паспеўшы стаць жонкай, ператварылася ва ўдаву.

## ТВОЙ СКАЧОК БАЧАЦЬ УСЕ...

Аматары сэлфі і экстрэмальных відэа — яшчэ адзін галаўны боль ратавальнікаў. Гэтую катэгорыю парушальнікаў бяспекі на вадзе прыцягваюць гідратэхнічныя збудаванні. У Мінску адно з такіх сумна вядомых месцаў з дрэннай рэпутацыяй — гідратэхнічнае збудаванне вадасховішча Дразды. Тут адбыўся не адзін няшчасны выпадак са смяротным зыходам.



Выпісваць штраф — у кампетэнцыі міліцыі, ратавальнікі могуць толькі папярэдзіць парушальніка.

— На будынку ўстаноўлены камеры відэаназірання і таблічкі з інфармацыяй аб забароне рыбнай лоўлі і купання. Але гэта не перашкаджае аматарам вострых адчуванняў залазіць на каркас збудавання, здзяйсняць скачкі і ныраць. У гэтым месцы ўжо танулі і нашы грамадзяне, і грамадзяне іншых краін, — расказаў **начальнік вадалазна-выратавальнай службы Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства выратавання на водах Дзмітрый ХРАПКОЎ.** — Тут сапраўды вялікая глыбіня, з-за гэтага — вельмі нізкая тэмпература вады. Разагрэты на сонцы чалавек ад рэзкага перападу тэмператур атрымлівае тэрмамеханічны шок, у выніку спыняецца сэрца. У гэтым выпадку — утапленне. Бываюць і пераломы шыйных пазванкоў, калі скачок у ваду здзейснены няправільна. Гэта таксама цягне за сабой гібель. Дзяжурная змена выратавальнай станцыі «Дразды» бывае тут штодня, а ў найбліжэйшы час будуць здзяйсняць планавыя абходы патрулі МУС.

— Урачам вельмі балюча, калі маладыя здаровыя людзі становяцца інвалідамі, — кажа **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Кірыл КРЫВАРОТ.** — Ныраў у гэтым месцы ўжо 10 гадоў, а тут прыплыў корч або вадаем абмяльчэў, чалавек ударыцца галавой і пашкоджвае шыйны аддзел пазваночніка. У выніку — параліч. Мы, нейрахірургі, выязджаем, аперыруем, але аперацыя, па сутнасці, артапедычная — вызваліць спінны мозг ад сціскання, выдаліць касцяныя абломкі. З самім спінным мозгам нічога, на жаль, зрабіць мы не можам, і гэта сусветная практыка. Пасля аперацыі чалавеку патрэбны будуць працяглая рэабілітацыя і лячэнне, якое, як правіла, не прыводзіць да поўнага выздараўлення. Таму наша рэкамендацыя: лепш на вадаёмах наогул не ныраць, для гэтага ёсць скачковыя басейны. А дзяцей трымаць на адлегласці выцягнутай рукі, каб яны каля вады былі пад пастаянным кантролем.

## КУПАЙСЯ НА ЗДАРОЎЕ!

Такім чынам, правілы паводзін на вадзе ў купальны сезон:

- Уваходзім у ваду толькі ў месцах для купання.
- Забяспечваем пастаянны нагляд за дзецьмі і пажылымі сваякамі.
- Не заплываем за буйкі.
- Не ўваходзім у ваду пасля каларыйнай ежы і асабліва — пасля ўжывання алкаголю.
- Не ныраем на натуральных вадаёмах, у тым ліку з трамплінаў, мастоў або абрывістага берага.
- Разагрэўшыся на сонцы, не ўваходзім у ваду рэзка — даём целу прывыкнуць да перападу тэмператур.
- Не сядаем у пракатнае судна без выратавальных жылетаў — яны павінны выдавацца разам з лодкай, катамаранам і г. д. у пунктах пракату. Жылет павінен быць менавіта выратавальны, а не страхавочны (першыя праходзяць сертыфікацыю, другія — не). Удакладніце гэты момант у супрацоўнікаў пракату.
- Цвяроза ацэньваем свае сілы і ўменне плаваць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Наперад у мінулае

# СКЛАДНІКІ СПАДЧЫНЫ, або УВАГУ ІНТЭР'ЕРАМ!

**УСЁ часцей мы з сумам назіраем за тым, як перакройваецца горад, як старыя будынкі пацясняюць новыя, з'яўляюцца прыбудовы, убіраюцца дрэвы, мяняюцца шыльды на магазінах. А з прыходам новых уласнікаў часта знікае энергетыка добра знаёмых з дзяцінства інтэр'ераў. Сёлета мы назіралі, як рабочыя знімаюць шыльду «Океан» з будынка ў цэнтры сталіцы. А як хваляваліся раней за «Бярозку» ці кавярню ва ўніверсаме «Цэнтральны». Мы ўжо навучыліся шкадаваць дэталі, звязаныя з уласнымі ўспамінамі, а ўслед за гэтым прыходзіць і разуменне таго, што савецкая архітэктура таксама стала спадчынай.**



Сёння ўжо нікому не трэба даказываць, як важна захаваць старыя фасады, але пакуль яшчэ мала хто задумваецца, што неабходна ратаваць, аднаўляць, рэканструяваць і інтэр'еры. На гэту праблему звярнулі ўвагу архітэктары-рэстаўратары Вадзім Глінік і Раман Забела.

Важна, каб гістарычныя будынкі не трапілі ў дрэнныя рукі, бо праз няведанне можна знішчыць каштоўныя дэталі спадчыны. Так, займацца праектнымі работамі сёння могуць многія, а вось спецыялістаў, якія здольны ўлічыць менавіта культурную вартасць аб'екта, не хапае (часта тут неабходны сур'ёзныя мультыдысцыплінарныя даследаванні, каб вывучыць будаўнічую гісторыю, матэрыялы, іх стан, пры неабходнасці правесці археалагічныя работы, вылучыць, што сапраўды варта захавання, якія напластаванні за якім часам з'явіліся). На ўсю Беларусь іх каля 40 чалавек. Навукова-практычны цэнтр «Рэстабіліс», які ўзначальвае Вадзім Глінік, якраз за такі кірунак адказвае. Некалькі гадоў архітэктар-рэстаўратар кіраваў работамі ў Полацку, апошнія гадоў дваццаць працуе на галоўнай вуліцы Мінска — праспекце Незалежнасці — і змагаецца за захаванне архітэктуры савецкага часу.

## ГРАНДЫЁЗНАЯ БУДОЎЛЯ

Планы па змене аблічча галоўнай вуліцы Мінска ўздымаліся яшчэ да вайны, але з-за існуючай на той час забудовы ажыццявіць іх не атрымлівалася. Пасля страшэнных разбурэнняў Вялікай Айчыннай вайны ідэі аб стварэнні прыгожага савецкага гораду ўжо нішто не перашкаджала. Да распрацоўкі генеральнага плана былі запрошаны найлепшыя архітэктары Савецкага Саюза.

Генеральны план па адбудове Мінска быў распрацаваны за кароткі час. І ўжо ў 1944 годзе, адразу пасля вызвалення горада, пачаліся работы.

Усё было прадумана — не толькі шырыня і напрамак вуліц, размяшчэнне і памер будынкаў, але і азеляненне і нават такія дробязі, як сметніцы і дзвярныя ручкі. Ад цэнтральнай вуліцы адыходзілі бульвары, планавалася развёрстка вуліц, дамоў, спраектаваны водна-зялёны дыяметр. Гэта быў самы маштабны ў гісторыі савецкай архітэктуры праект. Такой на кіламетры спланаванай забудовы не заклалі нават у Маскве (там пасля вайны не было настолькі моцных разбурэнняў, а гістарычныя будынкі раскіданы па ўсім горадзе). Да таго ж ствараўся ідэальны будаўнічы ансамбль, прадумвалася, як горад будзе выглядаць з розных пунктаў. Таму праспект Незалежнасці ў свой час і трапіў у прэтэндэнты на ўключэнне ў спіс ЮНЕСКА.

**Інтэр'ер — не толькі расфарбоўка, ляпніна, жырандолі, мэбля, дываны на падлогах. У тым ліку гэта і прастора. Тут не абысціся без вывучэння планіровачных рашэнняў, якія закладваліся ў будынкі пасляваеннымі архітэктарамі.**

Першай чаргой грандыёзнай будоўлі кіраваў архітэктар Парусьнікаў. Гэта дамы ад сённяшняй плошчы Незалежнасці да цырка. Увіце, два з паловай кіламетра, забудаваныя з двух бакоў дарогі, і гэта за кароткі пасля вайны час. У ансамбль былі ўключаны і некаторыя ацалелыя даваенныя будынкі. Архітэктары паклапаціліся, каб яны былі гарманічна ўпісаны ў новы Мінск. Тады закладвалася ідэя горада-сада з малымі гарадскімі формамі, паркавымі і гарадскімі скульптурамі.

Увага аддавалася аздабленню фасадаў, але і ўнутры будынкі, якія павінны былі служыць як публічныя месцы (магазіны, пункты харчавання і адпачынку), задумваліся з багата і стыльна аформленымі інтэр'ерамі.

Здзейсніць усе задумы пасляваенныя архітэктары не паспелі. Пасля смерці Сталіна пачалася барацьба з «празмернай» прыгажосцю. Максімальна заклалі новы горад удалося толькі да вуліцы Казлова. Пазней былі яшчэ ўзведзены асобныя будынкі, але такой комплекснай прадуманай забудовы ўжо не рабілі. І пра дэкор, з якім у 1950-х гадах аднаўлялся Мінск, таксама давялося забыць.

Больш за тое, захаваць адбудаванае таксама аказалася праблемай. Пасля пастановы аб барацьбе з «празмернасцямі» рамеснікі, якія пасля вайны ўручную стваралі складаныя элементы дэкору, аказаліся незапатрабаванымі. Была зменена і сістэма адукацыі. Калі архітэктура стала падпарадкоўвацца будаўніцтву, навучальныя ўстановы пачалі рыхтаваць спецыялістаў, гатовых «штампаваць» дамы, рабіць панэлі. «Дэкаратыўку», якая пачынала сыпаца, проста прыбіралі. Рамонты рабілі хто як мог...

## А ШТО ЎНУТРЫ?

Захаваліся старыя фотаздымкі, якія дазваляюць адчуць, якім архітэктары ўяўлялі свет у ідэальным савецкім горадзе. На час стварэння ансамбля праспекта большасць першых паверхаў мелі прадуманыя, багата аздобленыя інтэр'еры. Калоны, мазаіка, дробнапамерная плітка, імітацыя мармуру ў тынкоўках, керамічныя ўстаўкі, ляпніна. І пад гэта з густам падбіралася шпанаваная мэбля, ствараліся шыкоўныя жырандолі...

Рамонты, перастаноўкі, змены ўласнікаў і пагоня за больш сучасным аздабленнем сціралі сляды былой прыгажосці. З'яўленне ў 1990—2000-х гадах новых матэрыялаў таксама стала выклікам для старых інтэр'ераў. Бойкія дылеры добра ігралі на постсавецкім голадзе да будаўнічых матэрыялаў і ва ўсю стараліся збыць свой тавар. Часта тыпавыя праекты пераносіліся з аб'екта на аб'ект. А так званы «еўрарамонт» з'ядаў больш багатыя інтэр'еры. Дарагія трывалыя матэрыялы, якія маглі б служыць яшчэ многа гадоў, замяняліся на пластык, калоны зашываліся гіпсакардонам.

Новым пакаленням, якія ўжо выраслі без непрымання і адмаўлення ўсяго савецкага, засталася мала чаго аўтэнтычнага. Пасляваенныя інтэр'еры, падобныя на палацавыя залы, сёння маглі б быць той разынкай Мінска, якая была б цікавай і замежным гасцям.

Раней інтэр'еры аздабляліся пры дапамозе больш каштоўных матэрыялаў. Напрыклад, у 2000-х гадах з будынкаў праспекта Незалежнасці выкідаліся дубовыя дзверы. Сёння, каб замяніць ужо паржавелы метал зноў на натуральнае дрэва, трэба выкласці немалыя сумы. Так, металічныя дзверы можна знайсці за 300 долараў, а за масіўныя драўляныя сёння ўжо трэба выкласці 4—6 тысяч еўра.

Вельмі складана вяртаць спадчыну, калі за спінай няма дзяржаўнай падтрымкі. Сёння яшчэ можна пазмагацца за фасады, а вось інтэр'еры пакуль ніяк не ахоўваюцца, грошы на іх рэстаўрацыю не выдзяляюцца. Таму архітэктарам-рэстаўратарам даводзіцца шукаць падыходы да інвестараў, каб даказаць і каштоўнасць, і перавагі таго выгляду ўнутранага ўбрання памяшканняў, якімі іх задумвалі ў 1930-я, 1950-я, 1970-я гады. У асобных будынках удалося аднавіць аўтэнтычныя інтэр'еры. Напрыклад, у Доме афіцэраў і Палацы прафсаюзаў, Суvoраўскім вучылішчы.

Вяртаць можна не толькі гістарычныя формы, ляпніну, але і колеры. Яшчэ шмат сюрпрызаў можна адкрыць пад назапашанымі з гадамі пластамі фарбы ці матэрыяламі, якія закрываюць старыя сцены і падлогі. Па знойдзеных на гарышчы старых бра ці дзвярных ручках можна адліваць дэталі для сучаснага аздаблення памяшканняў.

Інтэр'ер — не толькі расфарбоўка, ляпніна, жырандолі, мэбля, дываны на падлогах. У тым ліку гэта і прастора. Тут не абысціся без вывучэння планіровачных рашэнняў, якія закладваліся ў будынкі пасляваеннымі архітэктарамі. І калі ўявіць, як раней людзі адчувалі сябе ў гэтай прасторы, можна таксама знайсці шмат цікавых ідэй для стварэння (альбо аднаўлення) каларыту, энергетыкі памяшкання.

Як аказалася, займацца аднаўленнем інтэр'ераў можна і ў межах звычайнага бягучага рамонту. Важна толькі, каб у ім былі задзейнічаны кваліфікаваны рэстаўратар, які можа ацаніць каштоўнасць элементаў і падказаць рашэнні па іх захаванні. У той жа час бягучы рамонт замест інструмента, які здольны павысіць вартасць гістарычных інтэр'ераў, можа і знішчыць каштоўныя дэталі.

Важна таксама даць магчымасць спецыялістам вывучыць і занатаваць інфармацыю пра аўтэнтычнае аздабленне гістарычных аб'ектаў.

І нават калі новыя ўласнікі не гатовы выдзеліць грошы, напрыклад, на аднаўленне старых роспісаў і дэкаратыўных элементаў, можна знайсці рашэнні, як пад рознымі «зашыўкамі» да часу прыхаваць рэшткі мінуўшчыны і такім чынам пакінуць шанцы для іх вяртання ў будучыні.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

---

Беларусь памятае

# Вяртанне героя



**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца ўнікальная рэліквія — ледзь уцалелая, пабурэлая ад крыві гімнасцёрка ўзору 1935 года з пяхотнымі малінавымі пятліцамі і двума лейтэнанцкімі кубікамі. Гімнасцёрка была знойдзена восенню 1949 года пры расчыстцы завалаў каля Цярэспальскіх варот Брэсцкай крэпасці. У кішэні ляжаў камсамольскі білет на імя Аляксея Фёдаравіча Наганава. Афіцэр быў сярод тых байцоў бессмяротнага гарнізона, хто на світанку 22 чэрвеня 1941 года прыняў на сябе ўдар ворага.**

У маі 1941 года разам з маладой жонкай Настассяй, ураджэнкай Брэсцкай вобласці, малады афіцэр пераехаў у саму крэпасць і атрымаў пакой у вежы над Цярэспальскімі варотамі.

Цярэспальскія вароты Брэсцкай крэпасці знаходзіліся на напрамку галоўнага ўдару ворага. Менавіта праз іх фашысты прарываліся ў цытадэль. Пасля магутнага артылерыйскага абстрэлу воіны, якім удалося выжыць, занялі аконныя праёмы ў казарме па абодва бакі ад варот. А ў вежы замацаваўся разам з байцамі лейтэнант Наганаў. Сіламі курсантаў палкавой школы ён рашыўся на кароткую раз'юшаную штыкавую контратаку і адкінуў ворага за вароты. Пасля на чале ўсяго двух стралковых узводаў арганізаваў абарону варот і доўга ўтрымліваў іх ад ворага. Маленькі гарнізон, які быў адрэзаны ад сваіх войск, не атрымліваў ніякіх загадаў ад вышэйшага камандавання, але ведаў і разумеў сваю баявую задачу.

Невядома, колькі часу байцы Наганава абаранялі Цярэспальскую вежу, на якой на зло ворагу працягваў лунаць чырвоны сцяг. Не ведаем мы і падрабязнасці гібелі афіцэра і яго байцоў. Верагодней за ўсё, немцы закідалі яго гранатамі. Падчас раскопак побач з Наганавым ляжаў яго пісталет. У абойме заставалася тры патроны, чацвёрты быў у канале ствала, а курок пісталета стаяў на баявым узводзе...

Настассі Наганавай удалося выжыць у той вайне. Яна вярнулася да бацькоў у вёску Матыкалы пад Брэстам. Дачку, што нарадзілася там увосень 1941 года, яна назвала Надзеяй.

Урач-педыятр Надзея Наганава прызнавалася: «Я часта пыталася ў маці, што ёй давялося перажыць, але яна не любіла ўспамінаць пра тыя жахлівыя дні. Уяўляю, як ёй было нялёгка застацца ўдавой у 19 гадоў, ды яшчэ цяжарнай. Паўсюль дзясяткі параненых, усё ўзрываецца, грыміць. Мама распавядала, што бацька быў камунікабельны, жыццярадасны, да яго цягнуліся людзі, ён вельмі любіў дзяцей». Надзея памятае, як раніцай 1949 года жыхары горада з вянкамі і букетамі накіраваліся да Брэсцкай крэпасці, каб правесці ў апошні шлях яе бацьку, байца лейтэнанта Наганава, які загінуў падчас бітвы. Жалобная працэсія расцягнулася больш чым на кіламетр. У 1965 годзе камандзір пешага ўзвода палкавой школы 333-га стралковага палка лейтэнант Аляксей Наганаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. А ў 1971 годзе, калі пачаў працаваць мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», прайшло ўрачыстае перапахаванне яго і іншых астанкаў абаронцаў крэпасці з гарнізонных могілак пад пліты мемарыяла.






Надзея Аляксееўна, калі пабывала ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе захоўваецца гімнасцёрка яе бацькі, прызналася: «Вы не ўяўляеце, як мне хацелася прыціснўцца да яе і дакрануцца да памяці роднага чалавека».

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**

Храмы маёй радзімы

**Сабор Трох Свяціцеляў, Свята-Мікольскі манастыр, Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор, Конкафедры Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і Святога Станіслава.** *г. Магілёў.*

# НАМОЛЕНЫЯ МЕСЦЫ НАД ДНЯПРОМ

**У кожнага чалавека — свая гісторыя хрышчэння. Большасць, мяркую, і не памятае, як іх хрысцілі, бо гэта адбылося, калі яны былі яшчэ немаўлятамі.**

**Мяне хрысцілі, калі мне споўнілася пяць гадоў. Помню, было змрочна і холадна, гарэлі свечкі. У купель мяне не акуналі, але давялося зняць калготачкі — я ўся заледзянела і потым захварэла. Гэта быў 1990 год, а храм для хрышчэння выбралі той, да якога было зручней за ўсё дабрацца бацькам і хросным, — сабор Трох Свяціцеляў. Бацька працаваў у Магілёўскім абласным тэатры лялек. Храм стаіць побач. Дакладней, не так: гэта тэатр стаіць побач з храмам.**

## ТАМ, ДЗЕ МЯНЕ ХРЫСЦІЛІ

Сабор Трох Свяціцеляў — помнік архітэктуры пачатку ХХ стагоддзя. Храм атрымаў назву ў гонар Васіля Вялікага, Рыгора Багаслова і Іаана Златавуста. У сабор можна ўвайсці з трох бакоў — гэта яго адметнасць. Як сведчаць крыніцы, першы камень храма быў закладзены ў 1903 годзе, у 1914 годзе будаўніцтва завяршылася. Змянілася ўлада, і ў 1961 годзе храм быў закрыты, а будынак аддадзены пад клуб завода «Строммашына». Завадчане хадзілі сюды на танцы, праводзілі гульні і творчыя спаборніцтвы. А ў 1979 годзе побач з былым храмам адкрыўся тэатр лялек.

Сабор зноў быў асвячоны і пачаў дзейнічаць 25 снежня 1989 года, у год адраджэння Магілёўскай епархіі.

Храм вянчаюць сем купалаў, а над уваходам знаходзіцца званіца. Калі пяюць званы — іх звон чуваць у тэатры. Дзіўна, але ў прыгожы храм, дзе мяне хрысцілі, я наведваюся зусім рэдка, хоць часта хаджу міма. Побач з саборам праходзіць шумная гарадская вуліца, праз дарогу — працуе завод, а насупраць — гудзе Цэнтральны кірмаш. Я люблю цішыню.

## ЗАЦЁРТЫЯ ФРЭСКІ ПАДМІКОЛЛЯ

Ціха — на Падміколлі. Калісьці, у маім маленстве, на падыходах да Падміколля густа рос баршчэўнік, а з-за лісточы векавых дрэў сонца не трапляла на зямлю. Але мы з сяброўкамі любілі там гуляць, і ў гэтым была казачная загадкавасць і асалода: спусціцца з маста праз Дняпро, ісці ў паўзмроку, слухаць шэпт дрэў і спевы птушак, а потым раптам аказацца ў дняпроўскай нізіне, залітай сонцам, дзе стаіць Свята-Мікольскі манастыр — праваслаўны жаночы манастыр з даўняй і няпростай гісторыяй. Намоленае месца.

Упершыню Свята-Мікольскі храм згадваецца ў летапісных крыніцах у 1522 годзе. Летапісы распавядаюць, што драўляная царква некалькі разоў была перабудавана, раскрадзена, а потым загінула ў пажары. У 1637 годзе прыхаджане збудавалі новую часовую драўляную царкву і келлі для ўладкавання манастырскага жыцця пры храме, а пазней — у 1672 годзе — была збудавана і асвячоная цагляная царква з прыдзеламі ў гонар Хрысціцеля Гасподняга Іаана і святога вялікамучаніка Дзімітрыя Салунскага. У царкве не было ацяплення.

Свята-Мікольскі жаночы манастыр дзейнічаў з 1637 да 1719 года, потым быў пераўтвораны ў мужчынскі, які існаваў да 1754 года. У 1798 годзе быў асвечаны новы зімовы храм з ацяпленнем. Цяпер гэта Ануфрыеўскі храм.

У 1934 годзе Свята-Мікольскі сабор закрылі. Там знаходзілася перасыльная турма, пазней — кніжная база. У сярэдзіне ХХ стагоддзя ўсе сцены храма, на якіх знаходзіліся цудоўныя фрэскі, зацерлі цэментам. Захаваўся толькі цэнтральны іканастас Мікольскага сабора — яго адвезлі на рэстаўрацыю ў Мінск.

Калі пачаліся рэстаўрацыйныя работы ў манастыры, там было знойдзена мноства чалавечых астанкаў: гледзячы па ўсім, гэта былі астанкі арыштантаў, што загінулі ў турме.

У 1989 годзе быў нанава асвечаны Свята-Ануфрыеўскі храм. Менавіта ў ім 5 жніўня 1993 года на пасяджэнні Свяшчэннага Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы да ліку мясцовашанаваных святых далучылі свяціцеля Георгія Каніскага.

## МАНЕТА, ПАДОРАНАЯ ІМПЕРАТАРАМ

У манастыры захоўваюцца спісы Магілёўска-Брацкай іконы Божай Маці, Бялыніцкай Божай Маці і іконы «Жыватворнае неба». А ўлетку 2000 года, у час кананізацыі Мікалая Другога, у Магілёве быў знойдзены партрэт імператара. Цяпер ён асвечаны як ікона і знаходзіцца ў левым прыдзеле Свята-Мікольскага сабора, які носіць назву у гонар Святых Царскіх мучанікаў. Да іконы прымацаваная 5-рублёвая манета, якую імператар падарыў хлопчыку Сямёну Халіпаву ў час наведвання храма.



Храм Царскіх мучанікаў, Новапакутнікаў і Спаведнікаў Царквы Рускай.

У канцы верасня 2005 года ў Магілёў завітала вялікая княгіня Вольга Мікалаеўна Кулікоўская-Раманава, жонка роднага пляменніка імператара — Ціхана Мікалаевіча. Княгіня падарыла Свята-Мікольскаму манастыру копію іконы Божай Маці «Траеручыца», якая знаходзілася ў Екацярынбургу ў Іпацьеўскім доме ў час зняволення царскай сям'і ў 1918 годзе.

Мікалай Другі з сям'ёй часта бываў у Магілёве. Тут захаваліся будынкі, дзе імператар жыў з сям'ёй, дзе знаходзілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў час вайны. Іншым разам можна пачуць фразу: «Магілёў — апошняя сталіца самадзяржаўя». Невыпадкова ў горадзе з'явіўся храм у гонар Царскіх мучанікаў, Новапакутнікаў і Спаведнікаў Царквы Рускай.



Касцёл Св. Станіслава.

Ідэя будаўніцтва храма належыць Высокапраасвяшчэннаму Максіму, архіепіскапу Магілёўскаму і Мсціслаўскаму. Месца пад будаўніцтва — знакавае: калісьці на Замкавай гары ўжо быў праваслаўны храм, а побач з паркам Горкага, што калісьці называўся Мікалаеўскім, знаходзіўся дом губернатара, у якім і змяшчалася Стаўка.

27 верасня 2002 года, у свята Уздзвіжання Крыжа Гасподняга, на месцы будучага храма быў устаноўлены і асвячоны Крыж з іконай святых царскіх пакутнікаў. У 2009 годзе ігумення Свята-Мікольскага манастыра Яўгенія падарыла прыходу храма звон дарэвалюцыйных часоў з выявай імператара Мікалая Другога. 27 мая 2011 года ў дзень каранацыі Мікалая Другога быў устаноўлены купал храма, а 17 лютага 2014 года Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Павел здзейсніў абрад вялікага асвячэння храма.

## НА МЕСЦЫ ПАЖАРУ

У парку Горкага ў савецкія часы знаходзілася сцэнічная пляцоўка і каруселі, па выхадных іграў духавы аркестр. Сёння тут ціха. Цвітуць кветкі, пасаджаныя дбайнымі прыхаджанкамі. З драўлянай тэрасы, што выходзіць на схіл Замкавай гары, добра бачныя сініясінія купалы храма, вельмі любімага і вядомага ў Магілёве. Трэба спусціцца па прыступках з парку, прайсці крыху наперад — і за Магілёўскім кірмашом вас сустрэне ўтульны і прыгожы Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор.

Асноўны прыдзел галоўнага храма сабора — у памяць Уздзвіжання Жыватворнага Крыжа Гасподняга, другі прастол — у імя святых Барыса і Глеба. Таму многія па-ранейшаму называюць сабор Барыса-Глебскай царквой, і ён таксама стаіць на намоленым месцы. У старажытных дакументах можна знайсці сведчанні, што на месцы царквы ў XVII стагоддзі знаходзіўся Барыса-Глебскі праваслаўны манастыр, у якім змяшчалася першая праваслаўная епіскапская кафедра Іосіфа, першага самастойнага беларускага епіскапа. Тут жа ў 1637 годзе другі епіскап беларускі ў Магілёве Сільвестр Косаў склікаў першы Магілёўскі епархіяльны сабор, была заснавана друкарня. Але ў пачатку XVIII стагоддзя манастыр загінуў у пажары. Аднаўлена была толькі царква — у 1869 годзе, на сродкі прыхаджан. Яе закрылі, калі прыйшла новая ўлада, але зноў адкрылі ў 1941 годзе, і доўгі час яна заставалася адзіным адкрытым храмам у Магілёве.

У гэтым храме я стала двойчы хроснай. Кожны раз гэта было незвычайнае адчуванне: як быццам я дакранулася да нябёсаў.

## ХРАМ З ПЯЧНЫХ ЦАГЛІН

Дакрануцца душой да нябёсаў у кожнага атрымаецца і ў Конкафедры Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і Святога Станіслава. Гэты надзвычай прыгожы помнік архітэктуры XVIII стагоддзя сціпла схаваўся за шчыльнай гарадской забудовай — гэтак, што адразу і не знойдзеш. Сабор збудаваны на месцы былога кармеліцкага кляштара. У 1636 годзе на тэрыторыі кляштара была збудавана драўляная царква ў імя Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, аднак у 1708 годзе падчас пажару яна згарэла, і толькі амаль праз 50 гадоў — у 1752 годзе — на яе месцы вырас каменны храм. Ёсць легенда, згодна з якой храм збудаваны з пячных цаглін, якія прынеслі гараджане як водкуп за забітага шляхціча.

25 снежня 1772 года Кацярына Другая абвясціла аб стварэнні ў Расійскай імперыі каталіцкай Беларускай епархіі з цэнтрам у Магілёве. Праз дзесяць гадоў Беларуская епархія была пераўтворана ў Магілёўскую архіепархію, і ёй сталі падпарадкоўвацца ўсе каталіцкія прыходы лацінскага абраду Расіі. З 1783 года сабор Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі стаў кафедральным саборам Магілёўскай архіепархіі. У Магілёве сабор часта называюць касцёлам Святога Станіслава, таму што яго апякун — Святы Станіслаў Рымскі.

У савецкі час у храме змяшчаліся Цэнтральны гістарычны архіў БССР, Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці — неверагодныя роспісы і ўнікальны арган з рэдкімі керамічнымі трубамі, які, згодна з паданнем, лічыўся ў Ватыкане пад нумарам «2», сышлі ў нябыт. Калі касцёл у пачатку 1990-х вярнулі вернікам, яго рэстаўрацыя доўжылася чатыры гады.

У нашы дні храм адкрыты. Ён прымае гасцей і ўдзельнікаў фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа»: сюды прыязджаюць артысты, выканаўцы духоўнай музыкі з усяго свету — сапраўднае свята шчырай веры, любові і святла.

## І ГЭТА СТАНЕ ГІСТОРЫЯЙ

Яшчэ адзін храм, пра які нельга не распавесці, быў збудаваны ў горадзе зусім нядаўна. Доўгі час



Сабор Трох Свяціцеляў.

у раёне Магілёва, які называецца Заднепроўе, не было ніводнага праваслаўнага храма. Ідэя збудаваць кафедральны сабор узнікла яшчэ ў 1996 годзе, і на яе ўвасабленне спатрэбілася амаль дваццаць гадоў.

Кафедральны Спаса-Праабражэнскі сабор — адзін з самых вялікіх у краіне. Праект быў распрацаваны Леанідам Макарэвічам, а канструкцыйная частка — архітэктарамі «Магілёўграмадзянпраекта». Храм свабодна змяшчае тры з паловай тысячы чалавек, а вышыня яго — шэсцьдзясят метраў. Яго купалы зроблены па самай сучаснай тэхналогіі — з лёгкага металу, пакрыты сплавам з нітрыду тытану, які вельмі доўга застанецца яркім і зіхатлівым. Іканастас храма выканалі беларускія разьбяры пад кіраўніцтвам Міхаіла Юрэвіча. Сабор асвячоны 6 жніўня 2015 года.

Хтосьці скажа — навадзел! Але ўсё, што мы робім сёння, заўтра становіцца гісторыяй. Я хачу, каб храмы, якія вырастаюць сёння, стаялі не адно і не два стагоддзі, не гінулі ў пажарах, а асвятлялі горад бляскам сваіх купалоў і радавалі жыхароў святочным перазвонам. Хачу, каб нашы праправраўнукі падыходзілі да іх і з захапленнем казалі: «Цудоўны храм! Намоленае месца!»

**Алёна БЕЛАНОЖКА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ООО «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ», 220055, г. Минск, ул. Алеся Гаруна, д. 25, пом. 1Н (комн. 8/12)** |

**Предмет аукциона, расположенный по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, район агрогородка Гатово**

**Имущество, реализуемое одним лотом, в составе: 5 ед. транспортных средств и 128 ед. оборудования. С составом имущества и подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by**

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 900 000,00 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 95 000,00 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в понедельник, среду, четверг, пятницу с 15.00 до 17.00 по предварительному согласованию. Ответственное лицо: Капустин Максим Григорьевич, ликвидатор, тел. +375 29 517-04-77

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 5 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **0,5** процента от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **16.07.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **15.07.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

# ОАО «Рогознянский»

**Предмет торгов – лот:** капитальное строение с инвентарным номером 101/С-8305 (наименование: двухэтажное кирпичное производственное здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 1048,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 87/1, на земельном участке с кадастровым номером 122581505102000005 площадью 1,9399 га.
Составные части и принадлежности: уборная, сарай, котельная

| Начальная цена, руб. | 1 базовая величина | Размер задатка, руб. | 1 базовая величина |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, тел./факс 80164165133.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
**Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона (в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона).
**Обременения:** наличие действующих договоров аренды.
**Обязательные условия продажи объекта за одну базовую величину:**
1) осуществление предпринимательской деятельности, в том числе ремесленной деятельности либо деятельности, при осуществлении которой физические лица, не осуществляющие предпринимательскую деятельность, уплачивают единый налог, с использованием приобретенного имущества (объекта) и (или) построенного нового после его снова в течение трех лет, начиная:
- не позднее одного года с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;
- в случае использования права сноса приобретенного объекта и строительства нового объекта либо сноса отдельных объектов, входящих в состав приобретенного недвижимого имущества, которые не могут быть использованы, – не позднее трех лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта. В целях использования данного права не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Жабинковский районный исполнительный комитет для получения разрешительной документации на снос объекта, а также на проектирование и строительство в порядке и в сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией;
2) запрещение отчуждения, передачи без перехода права собственности, залога приобретенного имущества (построенного нового, реконструированного), расположенного по адресу: Бресткая обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, д. 87/1 до выполнения покупателем условий договора купли-продажи, за исключением случаев его отчуждения, передачи без перехода права собственности юридическому лицу, собственником имущества, учредителем (участником) которого является покупатель, и принявшему на себя все обязательства и ответственность путем заключениям дополнительного соглашения о внесении соответствующих изменений в договор купли-продажи.

**Аукцион состоится 30 июня 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://ocenakabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02, 8 (029) 626-72-52

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 29 июня 2021 г. до 17.00**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ООО «Гард Плюс», г. Минск, ул. Кирова, д. 18, пом. 60, 61, 62, 6-й этаж, литер А 12/бл – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 600-18Б/2020 в экономическом суде г. Минска** |
| **Антикризисный управляющий** | **ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, 5-215, тел.: +375447331114, +375291308530** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 (одним лотом)**
**Адрес – Брестская обл., Малоритский р-н, северо-западнее д. Закрутин**

**Склад горюче-смазочных материалов** в составе: **баня** (73,5 кв. м, 103/С-187, составные части: каб. линии, покрытие, сети тепловые), **гараж** (395 кв. м, 103/С-194, составные части: каб. линии, покрытие, сети тепловые), **заправочная станция** (18,4 кв. м, 103/С-185, составные части: каб. линии), **казарма** (447,4 кв. м, 103/С-190, составные части: каб. линии, сети канализации, сети тепловые), **конюшня** (95,3 кв. м, 103/С-166), **котельная** (183,5 кв. м, 103/С-165, составные части: каб. линии, тепловые сети, резервуар для хранения мазута Р-100 (2 шт.), резервуар для хранения мазута Р-25 (8 шт.)), **КПП** (14 кв. м, 103/С-189, составные части: наруж. освещение, каб. линии, забор, наруж. освещение, забор), **ледник** (67,7 кв. м, 103/С-177), **пожарное депо** (325,3 кв. м, 103/С-157, составные части: холод. пристройка, каб. линии, теп. сети, 3 пож. водоема, резервуар для воды), **раздаточная** (94 кв. м, 103/С-155), **сварочный цех** (13,9 кв. м, 103/С-161, составные части: каб. линии), **овощехранилище** (33,1 кв. м, 103/С-195), **склады** (25,5 кв. м, 103/С-186 и 89,9 кв. м, 103/С-191), **столярный цех** (65,7 кв. м, 103/С-174, составные части: каб. линии), **убежище** (35,4 кв. м, 103/С-176), **уборная** (13 кв. м, 103/С-158), **хранилища – 7 зданий** (144,5; 157; 253,1; 265,4; 322,1; 732,4; 732,5 кв. м; 103/С-173, 103/С-172, 103/С-171, 103/С-193, 103/С-168, 103/С-169, 103/С-164; составные части № 103/С-193: каб. линии), **штаб** (211,6 кв. м, 103/С-170, составные части: каб. линии, сети канализации, сети тепловые), **насосная светлых нефтепродуктов** (187,3 кв. м, 103/С-162, составные части: наливная эстакада, каб. линии, железнодорожная эстакада, технологический трубопровод, резервуары РВС-1500 куб. м (15 шт.), резервуары РВС-300 куб. м (4 шт.), резервуары РВС-25 куб. м (6 шт.), **насосная темных продуктов** (64,4 кв. м, 103/С-163, составные части: тепловые сети, каб. линии, технологический трубопровод, резервуары РВС-300 куб. м (5 шт.), резервуары РВС-10 куб. м (4 шт.).
***В состав лота № 1 входит следующее движимое имущество:*** система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (инв. номер 00000017), котел КЧУ-41-31 (инв. номер 00000037), ворота распашные, калитки (инв. номер 38), насос вакуумный масляный УВД 1О.ООО (инв. номер 51), насос Р3 (инв. номер 00000009), насос 6 НДВ-Б (инв. номер 00000008), насос СВН-80 (инв. номер 00000010).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **25,2978** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатация склада горюче-смазочных материалов

**Начальная цена лота № 1 без НДС – 550 542,26 бел. руб.**
**Минимальная цена лота № 1 без НДС – 393 244,47 бел. руб.**

**Оборудование и транспортные средства, бывшие в употреблении. Местоположение – Брестская обл., Малоритский р-н, северо-западнее д. Закрутин**

| Номер лота | Наименование | Инвентарный номер | Начальная цена лота без НДС, бел. руб. | Минимальная цена лота без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 3 | **Сепаратор топливный СТ-500-2М** | 50 | **1 079,76** | **617,00** |
| 4 | **Виброкавитационный смеситель-гомогенизатор типа ВКИ-ВКГ** | 39 | **931,06** | **532,04** |
| | **Узел дозировки метиловых эфирных жирных кислот** | 0000036 | | |
| 5 | **Сепаратор топливный СТ5О0-2М** | 57 | **1 079,76** | **617,00** |
| 6 | **Малогабаритный производственный модуль МПМ «Дито»** | 58 | **2 478,13** | **1 416,07** |

Начальная цена снижена на 30 %

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни по предварительному согласованию, контактные телефоны: +375447148418 Анна, +375447331114, Ирина

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Дополнительная информация**

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)».
Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)».
Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1 (одного) процента для лота № 1 и 10 (десяти) процентов для лота № 2 от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано на ЕГРСоБ и в газете «Звязда» 15.05.2021

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 02.07.2021 в 09.00 Окончание торгов: 02.07.2021 в 16.00** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 15.06.2021 по 30.06.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**
Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Форма 1

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2021 г.

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 01.04.2021 | На 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 50 137 | 67 540 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 21 | 21 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 724 260 | 597 442 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 165 669 | 207 071 |
